ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

20 ЛІПЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №137 (28501)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Што сказаць, каб атрымаць работу



## Сакрэты гурта «MILKI»



## Як выглядае лідскі ручнік у 3D

СТАР. 16

# Полацкі дойлід Вольга



**Да Дня беларускага пісьменства, які пройдзе на пачатку верасня ў Полацку, мясцовымі школьнікамі і іх настаўнікамі зроблена дваццаць шэсць унікальных макетаў аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны Полацка, у тым ліку і страчанай. Яны будуць дэманстравацца на галоўнай плошчы святочнага горада. Свой макет — сярэднявечную ратушу — прадставіць і Полацкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі.**

**— Пра полацкую ратушу звестак зусім небагата. Мы не ведаем дакладна, калі яна была пабудавана, як выглядала, — кажа кіраўнік праекта па вырабе макета ратушы (а таксама дызайнер, архітэктар і «будаўнік» у адной асобе) Вольга РАДЗІШЭЎСКАЯ. — З архіўных крыніц вядома, што ўзвядзенне ратушы пачалося дзесьці пасля 1509 года. Абрысы будынка мы ўзялі з выявы полацкай іконы Мікалая Цудатворцы XVIII стагоддзя.**

**Некалькі месяцаў Вольга ў сваёй асабістай майстэрні ў вольны ад працы час, у асноўным па вечарах, рабіла дэталі макета: выпільвала, габлявала, збірала канструкцыю, клеіла, фарбавала, аздабляла. Настаўніца па прафесіі, яна набыла свой вопыт у дрэваапрацоўцы, калі дапамагала свайму бацьку і брату.**

**Прэм'ера калекцыі макетаў полацкіх помнікаў адбылася нядаўна ў Палацы культуры завода «Шкловалакно». Паглядзець і ацаніць «Полацкую Ратушу» прыйшло нямала ахвотных.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр БАГДЗЕВІЧ, намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта:**

*«Своечасовая і эфектыўная рэалізацыя комплексу мерапрыемстваў па супрацьдзеянні правапарушэнням пры ажыццяўленні знешнеэканамічнай дзейнасці альбо перамяшчэнні фізічнымі асобамі тавараў праз мытную мяжу дазволіла на 17% знізіць агульную колькасць правапарушэнняў, учыненых у першым паўгоддзі 2017 года, у параўнанні з аналагічным перыядам 2016 года».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9493 | ▼ |
| Еўра | 2,2468 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0329 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0751 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X
17137

Звязда. Падарожжа праз 100-годдзе

# ЯК ГАЗЕТА СВАЦЦЯЙ БЫЛА

## Дзякуючы «Звяздзе» класік беларускай літаратуры Максім Гарэцкі пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай

**У пачатку 1919 года адзін з рэдактараў «Звязды» Вільгельм Кнорын запрасіў Максіма Гарэцкага да сябе на работу. На той час газета выходзіла ў Мінску. Але неўзабаве рэдакцыя перабралася ў Вільню. З ёй пераехаў і пісьменнік...**



Максім ГАРЭЦКІ.

У Вільні ён застаўся і пасля раптоўнага захопу горада польскімі войскамі: не паспеў вярнуцца ў Мінск. Супрацоўнічаў з мясцовымі выданнямі. Калі 1 чэрвеня 1919 года там адкрылася першая Беларуская гімназія, у якой усе прадметы выкладаліся пабеларуску, вельмі ўзрадаваўся. І не толькі таму, што хацеў выкладаць. Аказваецца, што тамтэйшая настаўніца Леаніла Чарняўская складала чытанку для школьнікаў «Родны край». З ёй акурат і імкнуўся пазнаёміцца Гарэцкі.

СТАР. 15

■ Балючая тэма

# Абмежаваны доступ

## Моцны алкаголь будзе даражэць, а тым, каму няма 21 года, спіртныя напоі не прададуць?

**Такія меры дзейнічаюць у многіх развітых краінах, а ў хуткім часе будуць прынятыя і ў нас. Шраг захадаў па абмежаванні даступнасці алкаголю ўжо зроблены, актыўна вядзецца распрацоўка іншых мер. Размова ідзе пра абмежаванне рознічнай рэалізацыі спіртнога ў вячэрні і начны час, пра продаж такой прадукцыі на пэўных гандлёвых плошчах, пра размяшчэнне саміх пляцовак. Усе гэтыя меры даюць свой станоўчы вынік там, дзе яны ўжо дзейнічаюць. Скажам, абмежаванне ў начны час зніжае розныя правапарушэнні, якія ўчыняюцца акурат пасля «дагонкі», патрэбнай менавіта тым, хто ўжо нападпітку.**

### Правы спажыўца ці здароўе нацыі?

Практыка паказвае, што калі алкаголь знаходзіцца на адлегласці выцягнутай рукі — так, як у нас сёння, — дык рука нярэдка сама цягнецца па яго, нават калі паход у магазін быў абгрунтаваны зусім іншай мэтай. На такія паводзіны мы правакуем у першую чаргу маладых людзей. Дарэчы, Міністэрства аховы здароўя зноў прапануе падняць узрост продажу алкагольных напояў з 18 гадоў да 21. Праціўнікі гэтага рашэння спасылаюцца на тое, што такім чынам абмяжоўваюцца спажывецкія правы... Але ж медыкі стаяць на сваім: правы правамі, але ж варта ўрэшце і над прамой шкодай для здароўя паразважаць.

СТАР. 3

**Да 100-годдзя «Звязды» засталося 20 дзён**

## На ўсе 100!!!

**За без дваццаці дзён векавую гісторыю звяздоўцы не страцілі энтузіязму і азарту! Мы запрашаем вас, шаноўныя чытачы, вашых блізкіх і сяброў на актыўнае свята, дзе вы зможаце паспаборнічаць у гіравым спорце і варкаўце, паўдзельнічаць у майстар-класах ад рэкардсмена Гінеса (аўтара больш як 100 сілавых рэкордаў!) Вячаслава Харанекі і ўбачыць гульню найлепшага міні-футбольнага клуба краіны «Сталіца»!**

**Вас чакае мора спартыўнага драйву, падарункі ад газеты «Звязда», аўтограф-сесія са знакамітымі спартсменамі, фотазона, прыемная музыка і сяброўская атмасфера!**

**Свята адбудзецца ў суботу 29 ліпеня на спартыўнай пляцоўцы сталічнага Ліцэя №1 (праспект Газеты «Звязда», 6А).**

**Пачатак у 11.00. УВАХОД ВОЛЬНЫ.**

# АФІЦЫЙНЫ ВІЗІТ У КІЕЎ

**На два дні, 20—21 ліпеня, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся ва Украіну, дзе запланаваны перагаворы ў фармаце сам-насам і ў пашыраным складзе з Прэзідэнтам Украіны Пятром Парашэнкам.**

Тэмай сустрэч стане развіццё двухбаковага палітычнага, гандлёва-эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва. Асноўная ўвага будзе ўдзелена эканамічнай сферы, у тым ліку гандлю, інвестыцыям, прамысловай кааперацыі, нафтахімічнаму комплексу, энергетыцы, сельскай гаспадарцы, транспартна-лагістычнай галіне і развіццю міжрэгіянальнага партнёрства. Да таго ж плануецца ўзгадніць падыходы да прыгранічнага супрацоўніцтва.

Адной з тэм сустрэчы стане ўрэгуляванне канфлікту на ўсходзе Украіны. Беларусь актыўна ўдзельнічае ў гэтым, арганізуючы перагаворную пляцоўку для бакоў працэсу. Акрамя таго, прэзідэнты абмяркуюць сітуацыю ў рэгіёне ў цэлым і абмяняюцца думкамі наконт міжнароднай праблематыкі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Чакаецца, што па выніках перагавораў будзе падпісаны шэраг дакументаў, якія датычацца супрацоўніцтва ў эканоміцы, навукова-тэхнічнай галіне, культуры і міжнацыянальных адносінах.

# Усе атрымалі адказы

**Учора намеснік прэм'ер-міністра Васіль ЖАРКО правёў прыём грамадзян у Пінску.**


Фота БЕЛТА.

Жыхароў горада, якія прыйшлі на прыём, хвалявалі пытанні працаўладкавання, медыцынскай дапамогі, прадастаўлення сацыяльнага жылля, рэканструкцыі спартыўных аб'ектаў, налічэння дапамог, паведамляе БЕЛТА. «Пераважалі пытанні сацыяльнай абароны. Падчас прыёму практычна ўсе, хто звярнуўся, атрымалі адказы. Большасць пытанняў можна было вырашыць на мясцовым або абласным узроўні: яны не патрабуюць прыняцця нарматыўных дакументаў або законаў. Але заўсёды трэба падыходзіць да кожнага, хто звяртаецца, індывідуальна, згодна з літарай закона», — падкрэсліў намеснік прэм'ер-міністра.

У ходзе прыёму Васіль Жарко даў даручэнне рэканструяваць гарадскі стадыён «Прыпяць» у Пінску, а таксама паведаміў, што ў Ляснянскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў Баранавіцкага раёна восенню бягучага года адкрыецца аддзяленне для знаходжання людзей з псіхаНеўралагічнымі захворваннямі.

■ Наша пазіцыя

# КРОКІ ДА АГУЛЬНАЙ МЭТЫ

## Дзеянні Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця прадставілі ў штаб-кватэры ААН

**Там, у Нью-Ёрку, прайшла агульная дыскусія міністэрскага сегмента палітычнага форуму высокага ўзроўню па ўстойлівым развіцці. Падчас яе нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна ШЧОТКІНА прадставіла даклад нашай краіны.**

Тэматыка сёлетняга форуму акрэслена як «Выкараненне галечы і садзейнічанне росквіту ў свеце, які змяняецца». Кіраўнік беларускай дэлегацыі адзначыла меры, якія ўжо прыняты ў Беларусі для рэалізацыі мэт да 2030 года, а таксама нашы найбліжэйшыя планы. Адзін з намераў — выбудаваць цеснае ўзаемадзеянне паміж заканадаўчай і выканаўчай уладамі дзеля дасягнення Мэт устойлівага развіцця. З гэтай жа нагоды будзе выкарыстаны механізм парламенцкіх слуханняў і нацыянальных кансультацый з удзелам шырокага кола партнёраў, у тым ліку грамадзянскай супольнасці.

Мар'яна Шчоткіна адзначыла заснаванне Прэзідэнтам Беларусі паста нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, а таксама стварэнне нацыянальнага савета па ўстойлівым развіцці на ўзроўні кіраўніцтва профільных органаў дзяржаўнага кіравання і рэгіёнаў краіны. Акрамя гэтага, яна звярнула ўвагу на праблемы дзяржаў з сярэднім узроўнем даходу. «Як краіна з сярэднім узроўнем даходу, Беларусь выступае за больш скаардынаваную падтрымку намаганняў у галіне развіцця гэтай катэгорыі краін, — адзначыла Мар'яна Шчоткіна. — Прапануем прыняць асобны план дзеянняў ААН па працы з краінамі з сярэднім прыбыткам па прыкладзе аналагічных планаў для іншых катэгорый дзяржаў, якія развіваюцца, а таксама распрацаваць крытэрыі, якія выходзяць за рамкі толькі даходу на душу насельніцтва».

Да таго ж віцэ-спікер Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на інтэграцыйныя аб'яднанні. У гэтым кірунку важную ролю выконваюць рэгіянальныя структуры, якія звязваюць дзейнасць на глабальным і нацыянальным узроўнях. Яна нагадала пра ідэю інтэграцыі інтэграцый, а таксама прапанавала выкарыстоўваць пляцоўку Еўразійскай эканамічнай камісіі ААН для абмеркавання шляхоў узаемадзеяння паміж інтэграцыйнымі аб'яднаннямі.

Таксама Мар'яна Шчоткіна сустрэлася з першым намеснікам Генеральнага сакратара ААН Амінай Махамед, якая высока ацаніла дзейнасць Беларусі па дасягненні мэт устойлівага развіцця.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Знешняя палітыка

# Дыялог з паўночнымі суседзямі

## Міністр замежных спраў Латвіі прыехаў з рабочым візітам у Мінск

**У нашай краіне працуе звыш 900 кампаній з латвійскім капіталам. Гэта сведчыць пра пэўны давер і ўзаемны інтарэс паміж дзвюма краінамі. На сустрэчы міністраў замежных спраў Беларусі і Латвіі бакі абмеркавалі перспектывы супрацоўніцтва.**

Актывізацыю кантактаў паміж дзяржавамі адзначыў **кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі Уладзімір МАКЕЙ.** На гэта ўплывае і працэс нармалізацыі стасункаў нашай рэспублікі з Еўрапейскім саюзам. Павышэнне ўзроўню двухбаковых палітычных кантактаў спрыяе развіццю раўнапраўнага дыялогу і супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай сферы. Міністр замежных спраў Беларусі адзначыў патэнцыял у такіх галінах, як дрэваапрацоўка, вытворчасць харчовай прадукцыі, фармацэўтыка, лагістыка, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, турызм і будаўніцтва. Да таго ж новыя магчымасці ва ўзаемадзеянні адкрываюцца для нашых краін як удзельнікаў ініцыятывы эканамічнага пояса Шаўковага шляху.

Уладзімір Макей адзначыў, што цяпер, напярэдадні правядзення ў Беларусі і Латвіі чэмпіянату свету па хакеі 2021 года, неабходна пачынаць працу па стварэнні сумесных турыстычных маршрутаў, удасканаленні аўтамабільнай інфраструктуры і прыдарожнага сэрвісу. Гэта дапаможа эфектыўна выкарыстаць турыстычны патэнцыял абедзвюх краін.

Па выніках перагавораў **міністр замежных спраў Латвіі Эдгарс РЫНКЕВІЧС** падкрэсліў, што ў Латвіі няма больш пытанняў да беларуска-расійскіх вучэнняў «Захад-2017». Нягледзячы на тое, што Беларусь і Латвія належаць да розных блокаў — АДКБ і НАТА адпаведна, — узаемадзеянне ў галіне бяспекі ідзе канструктыўна. «Мы з павагай ставімся да выбару, які ёсць у нашых краін у сферы ваеннай бяспекі», — дадаў міністр замежных спраў Латвіі. Таксама Эдгарс Рынкевічс адзначыў станоўчыя зрухі ў аб'ёмах гандлю пасля пэўнага крызіснага перыяду.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# БЕЗ БЮРАКРАТЫЗМУ

## Амаль 16 тысяч зваротаў паступіла ў дзяржаўныя органы Міншчыны за першае паўгоддзе 2017 года

**Аб гэтым заявіла начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аксана ТАРАНДА на пасяджэнні, прысвечаным рэалізацыі патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта №2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва».**

— Лічбы ў цэлым паўтараюць аналагічны перыяд за 2016 год, — адзначыла спецыяліст.

Аналіз тэматыкі зваротаў і званкоў на прамыя тэлефонныя лініі паказаў, што ў 2017 годзе колькасць заяў па пытаннях камунальнай і дарожнай гаспадаркі склала 42% ад усіх зваротаў, што значна перавышае паказчыкі папярэдніх пяці гадоў. Жыллёвыя праблемы падмяліся ў 15% скаргаў. Узрасла колькасць зваротаў па пытаннях камунальнай і дарожнай гаспадаркі, упершыню за 5 гадоў вырасла колькасць зваротаў аб правядзенні рамонту жылля.

На думку начальніка аддзела, рост колькасці зваротаў не заўсёды сведчыць аб недастатковa добрай працы спецыялістаў дзяржаўных органаў. «Часта людзі звяртаюцца ва ўсе запар арганізацыі, спадзеючыся, што іх праблема будзе вырашана», — растлумачыла Аксана Таранда. На яе думку, паўторныя звароты часам выкліканыя невыкананнем абяцанняў, але часцей гэта спробы пры дапамозе вышэйстаячых органаў вырашыць праблемы, якія не заўсёды абгрунтаваны, а часам супярэчаць існуючаму заканадаўству.

Тым не менш з боку чыноўнікаў ёсць выпадкі парушэння тэрмінаў разгляду зваротаў, перапісвання адказаў, пераносу тэрмінаў выканання абяцанняў. Так, па фактах парушэння заканадаўства аб зваротах за 2016 год да дысцыплінарнай адказнасці прыцягнуты 8 работнікаў аблвыканкама, 89 — райгарвыканкамаў, 10 — выканкамаў пярвічнага ўзроўню. У 2017 годзе таксама аб'яўлены спагнанні шэрагу дзяржаўных служачых, у большай ступені раённага і гарадскога ўзроўняў. Яшчэ Аксана Таранда звярнула ўвагу на нізкую эфектыўнасць выязных пасяджэнняў асобных старшынь і намеснікаў старшынь райгарвыканкамаў.

— Па якой прычыне з'яўляюцца паўторныя звароты? Папершае, калі адбылася змена кіраўніцтва, па-другое, калі ў раёне людзі не могуць знайсці адказы на свае пытанні і вырашыць праблемы, — лічыць **старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Анатоль ІСАЧАНКА**. — Таму трэба старанна аналізаваць звароты, з якой прычыны яны адбываюцца, каб мы маглі ўплываць на гэтую сітуацыю. На мой погляд, цяпер гэта галоўнае.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## 760 мільёнаў чалавек у свеце застаюцца за мяжой беднасці



За апошнія дзесяць гадоў больш за мільярд чалавек змаглі вырвацца з галечы, але прыкладна 760 мільёнаў усё яшчэ жывуць за мяжой беднасці — на 1,9 долара штодзень. Пра гэта, як перадае ІА «Финмаркет», гаворыцца ў новым дакладзе Генеральнага сакратара ААН Антоніу Гутэрыша аб ходзе рэалізацыі парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця. Даклад прымеркаваны да міністэрскай сустрэчы ў рамках палітычнага форуму высокага ўзроўню па ўстойлівым развіцці.

Генсек ААН адзначыў, што 760 мільёнаў чалавек усё яшчэ жывуць у галечы. Многія дзеці ва ўзросце да пяці гадоў не атрымліваюць паўнавартаснага харчавання. У 2016 годзе ў 155 мільёнаў з іх была адзначана затрымка росту. Годам раней 5,9 мільёна малых памерлі, не дажыўшы да пятага дня нараджэння. У гэты ж год падчас цяжарнасці і родаў памерлі 30 000 жанчын. У ААН лічаць, што матэрыяльныя каштоўнасці, звязаныя з поспехамі ў галіне развіцця, размяркоўваюцца нераўнамерна, як паміж краінамі, так і паміж сельскімі і гарадскімі жыхарамі, і нават паміж жанчынамі і мужчынамі.

17 мэт устойлівага развіцця на перыяд да 2030 года былі аднагалосна прыняты ўсімі 193 дзяржавамі — членамі ААН у ходзе гістарычнага саміту ў верасні 2015 года. У гэтым парадку дня сусветныя лідары паабяцалі «пакласці канец галечы і голаду ва ўсіх іх формах і праявах і дамагчыся, каб усе людзі маглі жыць у здаровым навакольным асяроддзі і рэалізаваць свой патэнцыял ва ўмовах вартасці і роўнасці».

## Кіраўнік нямецкага МЗС выступіў за адмену санкцый супраць Расіі

Кіраўнік МЗС Германіі Зігмар Габрыэль у інтэрв'ю нямецкаму часопісу Focus адзначыў, што паступовая адмена антырасійскіх санкцый мае сэнс.

«У адпаведнасці з рашэннем Еўрапейскага саюза мінскія пагадненні павінны быць выкананы на 100 працэнтаў, перш чым антырасійскія санкцыі могуць быць цалкам адменены. Я мяркую, што гэта немагчыма ажыццявіць. Больш правільна было б паслядоўна адмяняць санкцыі, паказваючы, што трэба рухацца ў кірунку да міру», — сказаў Габрыэль. Акрамя таго, кіраўнік МЗС ФРГ выступіў за новую палітыку Берліна ў дачыненні да Масквы, якая заключаецца ў разрадцы напружанасці. Частыя сустрэчы з прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным ён растлумачыў наяўнасцю «мноства праблем».

Краіны Захаду пастаянна ўскладаюць на Маскву адказнасць за выкананне мінскіх пагадненняў, а таксама звязваюць з гэтым зняцце санкцый. У сваю чаргу Расія нагадвае, што з'яўляецца адным з гарантаў мінскага працэсу, а не бокам канфлікту.

## Фінляндыя аднаўляе сістэму бункераў



Улады Фінляндыі актыўна ўдасканальваюць сістэму бункераў і тунэляў пад Хельсінкі, каб яна была здольная вытрымаць «расійскую агрэсію», паведамляе The Wall Street Journal. У Мінабароны краіны выданню заявілі, што падобная мера неабходная ў святле адносін паміж Расіяй і Захадам, якія абвастрыліся.

Па даных WSJ, працягласць сістэмы бункераў складзе каля 200 кіламетраў. У мірны час падземныя аб'екты будуць знаходзіцца ў грамадзянскім карыстанні, але ў выпадку абвяшчэння вайны яны на працягу некалькіх дзён змогуць быць пераабсталяваны ў прытулкі і камандныя цэнтры, перадае РІА «Навіны». Аўтар матэрыялу Томас Груў адзначае, што ў падземным горадзе можна будзе размясціць усё насельніцтва Хельсінкі (больш за 600 тысяч чалавек). Сучасная сістэма камунікацый забяспечыць эвакуяваных беспераробійнай сувяззю і дазволіць ураду кіраваць краінай у бяспецы.

Выданне адзначае, што асноўную занепакоенасць у фінаў выклікаюць наступныя расійска-беларускія стратэгічныя вучэнні «Захад-2017». Раней паведамлялася, што расійскія і беларускія ваенныя пры распрацоўцы сцэнарыя вучэнняў улічаць сітуацыю, звязаную з узмацненнем актыўнасці НАТА паблізу граніц Саюзнай дзяржавы.

■ Масмедыя

# Не проста газета

**Шматфункцыянальнымі медыйнымі цэнтрамі заклікаў стаць раённыя газеты намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ. У Гомелі ён узяў удзел у рэгіянальным семінары «Інфармацыйнае забеспячэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця Гомельскай вобласці і задачы сродкаў масавай інфармацыі».**

Гомельская вобласць стала трэцім рэгіёнам пасля Віцебшчыны і Гродзеншчыны, дзе правялі семінар, накіраваны на павышэнне эфектыўнасці ўдзелу СМІ ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны.

— У сучасных умовах рэдакцыі раённых газет павінны стаць своеасаблівымі медыйнымі цэнтрамі, якія будуць выкарыстоўваць у рабоце самыя розныя спосабы і сродкі. Такімі ж цэнтрамі павінны стаць рэдакцыі — усё роўна ў Мазыры ці Нароўлі, у вялікім горадзе ці маленькім, працуе там 15 супрацоўнікаў ці тры—пяць, — адзначыў намеснік міністра.

Як прыклад, на Гомельшчыне Аляксандр Карлюкевіч прывёў дзейнасць рэдакцыі абласной газеты «Гомельская праўда», якая мае свае выдавецтва, радыё і інтэрнэт-партал. Абмеркаванні тэмы пройдуць ва ўсіх абласцях, а на восень запланавана выніковае мерапрыемства ў Мінску.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** iost@zviazda.by

■ Полюс інтарэсаў

# НЕ СЯДЗЕЦЬ НА ПРЫСТАЎНЫМ КРЭСЛЕ

**Беларусь збіраецца атрымаць статус кансультацыйнага боку Дагавора аб Антарктыцы. Пра гэта расказаў начальнік Беларускай антарктычнай экспедыцыі (БАЭ) Аляксей ГАЙДАШОЎ падчас пашыранага рабочага пасяджэння Міжведамаснай камісіі па пытаннях Антарктыкі. Мэтай мерапрыемства былі разгляд ходу выканання Плана мерапрыемстваў па рэалізацыі Дагавора аб супрацоўніцтве ў Антарктыцы паміж урадамі Беларусі і Расіі, абмеркаванне планаў навуковага і лагістычнага партнёрства з Расійскай Федэрацыяй на 2017—2018 гады, у тым ліку ў межах правядзення 10-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі.**

— Першае пытанне, якое стаіць у нас на парадку дня, — аналіз інфармацыі ад беларускай дэлегацыі, якая ўдзельнічала ў 40-й кансультацыйнай нарадзе па Дагаворы аб Антарктыцы, што прайшла ў Пекіне некалькі месяцаў таму, — расказаў Аляксей Гайдашоў. — Таксама будзе разглядацца пытанне падрыхтоўкі пакета дакументаў у міжнародныя органы на ўзгадненне статусу кансультацыйнага боку. Калі ўсё атрымаецца, гэта паставіць нас на адзін узровень з самымі буйнымі эканомікамі свету, якія ўдзельнічаюць у рабоце сістэмы Дагавора аб Антарктыцы. Права голасу, права вета, права ўдзелу ў распрацоўцы і прыняцці рашэнняў, якія датычацца сучаснасці і будучыні «белага» кантынента, — вось што атрымае Беларусь у гэтым выпадку. Таму для краіны пытанне стратэгічнае. Мы ўжо не будзем сядзець, як той казаў, на прыстаўным крэсле, а станем непасрэдна ўдзельнічаць ва ўсіх працэсах па ўрэгуляванні дзейнасці на шостым мацерыку планеты.

Як адзначыў начальнік БАЭ, пытанні двухбаковага супрацоўніцтва з Расіяй не абмяжоўваюцца сферамі навукі і лагістыкі. Вялікую дапамогу нашай краіне расіяне аказваюць якраз на міжнароднай арэне. Так, у Пекіне разглядалася пытанне аб перапрацоўцы працэдуры ўзгаднення статуса кансультацыйнага боку ў Дагаворы аб Антарктыцы. Першапачаткова праект дакумента быў вынесены на абмеркаванне ў вельмі жорсткай рэдакцыі, якая магла негатыўным чынам адбіцца на працы палярнікаў з Беларусі і іншых краін, якія яшчэ не маюць гэтага статусу. Дзякуючы ў тым ліку і цвёрдай пазіцыі дэлегацыі Расіі ўдалося зрабіць яго больш дэмакратычным.

Падрыхтоўчыя работы па фарміраванні чарговай БАЭ ўжо распачаліся. У жніўні пройдуць першыя этапы падрыхтоўкі ўдзельнікаў экспедыцыі. На кожнае вакантнае месца будуць разглядацца па 3—4 кандыдаты. Усяго плануецца адправіць у Антарктыду 6 ці 7 спецыялістаў (у залежнасці ад фінансавання). Яны пройдуць гутарку, псіхалагічнае тэсціраванне, медыцынскую камісію, праверку на прафесійную прыгоднасць. Па папярэднім графіку навукова-экспедыцыйнае судна «Акадэмік Фёдараў» высадзіць удзельнікаў БАЭ у раёне базіравання ў сярэдзіне снежня. Эвакуацыя запланавана на канец лютага або пачатак сакавіка. Апроч навуковай работы спецыялісты зманціруюць і ўстановяць на платформу чарговыя тры секцыі Беларускай антарктычнай станцыі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** lyskavets@zviazda.by

■ Спадчына

# ФАНФАРЫ НА ВЕЖЫ



**Гродзенскую каланчу — помнік архітэктуры пачатку XX стагоддзя — чакае рэканструкцыя. Аб гэтым падчас прэс-канферэнцыі паведаміў начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ШПАРЛО.**

Гродзенская пажарная каланча — адзін з самых вядомых турыстычных аб'ектаў абласнога цэнтра. Тут ёсць і свой унікальны штрышок — штодня роўна апоўдні на верхнюю пляцоўку падымаецца трубач у старажытным парадным адзенні, каб зайграць «беларускія фанфары». Гэта азначае, што ў горадзе ўсё спакойна. На самым версе каланчы прымацаваны масіўны медны флюгер у выглядзе пажарнага, які трымае за хвост «чырвонага пеўня».

Раней на 32-метровую каланчу маглі падняцца турысты, але цяпер уваход забаронены. Вінтавая драўляная лесвіца ў 120 прыступак патрабуе рамонту. Сяргей Шпарло зазначыў, што праект рэканструкцыі ўключаны ў праграму трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча—Беларусь—Украіна» і ўдала прайшоў першы этап конкурснага адбору, канчатковыя вынікі будуць падведзены ў лютым будучага года.

У план рэканструкцыі таксама ўваходзяць умацаванне вонкавых сцен вежы, карнізаў, замена вокнаў і абсталяванне сучаснай падсветкі. Будзе рэстаўрыравана і глядзельная пляцоўка, адкуль з вышыні птушынага палёту турысты змогуць убачыць горад. Плануецца, што каланча атрымае новае аблічча да 2020 года.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** margo@zviazda.by

**Даведка:**

**Першыя звесткі аб пажарнай каланчы адносяцца да канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Яе пабудова адбылася пасля таго, як пажар, што бушаваў некалькі дзён, знішчыў амаль паўгорада. Разам з аднаўленнем Гродна ішло будаўніцтва пажарнага дэпо і вежы, на якой знаходзіўся дзяжурны. Ён біў у званы пры ўзгаранні дзе-небудзь. Пажарнае дэпо паранейшаму дзейнічае, а ў сценах вежы размясцілася цікавая музейная экспазіцыя пажарна-выратавальнай службы. Яшчэ адна цікавінка: на фрэсцы, якая ўпрыгожвае фасад будынка дэпо, супрацоўніца МНС у службовай форме нагадвае з твару знакамітую Мону Лізу. Аўтарам фрэскі з'яўляецца вядомы гродзенскі мастак Уладзімір Качан.**

■ Футбол

# ПРАГА — ПРАМА ПА КУРСЕ

## Барысаўскі БАТЭ прабіўся ў 3-і кваліфікацыйны раўнд Лігі чэмпіёнаў

**Пасля дамашняй нічыёй тыдзень таму (1:1) у гасцявой сустрэчы падапечныя Аляксандра Ермаковіча перамаглі ерэванскі «Алашкерт» з лікам 3:1, што дазволіла ім працягнуць удзел у самым прэстыжным футбольным турніры Еўропы.**



На 18-й хвіліне сербскі форвард «Алашкерта» Ураш Ненадавіч трапіў у вароты Дзяніса Шчарбіцкага — 1:0, гэта прымусіла барысаўчан зайграць больш актыўна, і ўжо праз пяць хвілін пасля прапушчанага мяча Міхаіл Гардзяйчук зраўняў лік, а на 35-й хвіліне сустрэчы ён жа другі раз трапіў у вароты гаспадароў.

*— Мы хацелі выйграць — і зрабілі гэта. Вядома, было цяжка. Зрэшты, іншага і не чакалі. Яшчэ да матча разумелі: ва ўмовах спёкі прыйдзецца гуляць праз «не магу». Атрымалася праявіць маральна-валявыя якасці. Ад таго значасць перамогі яшчэ вышэйшая. На мае галы працавала ўся каманда. Хлопцы — малайцы,* — адзначыў Міхаіл.

На 78-й хвіліне Максім Валадзько забіў трэці мяч, зняўшы ўсе пытанні пра перамогу.

*— Пачатак матча для нас склаўся горш не прыдумаеш. Мала таго, што цяжка было прыстасавацца да няпростых умоў надвор'я, нязвыклага газона, дык яшчэ і прапусцілі. Але змянілі ход сустрэчы за кошт валявых якасцяў, характару,* — падкрэсліў **галоўны трэнер БАТЭ Аляксандр ЕРМАКОВІЧ.** *— Плюс выканальніцкае майстэрства таго ж Мішы Гардзейчука. Гол, які ён забіў, надаў камандзе ўпэўненасці. Напэўна, мы былі мацнейшыя ў плане рэалізацыі сваіх момантаў. Мы былі адным кулаком, адзіным калектывам, біліся адзін за аднаго, гэта самае галоўнае.*

У 3-м крузе кваліфікацыі галоўнага кантынентальнага турніру чэмпіёны Беларусі будуць сапернічаць з найлепшай камандай Чэхіі, пражскай «Славіяй». Першая сустрэча адбудзецца 25 ліпеня ў чэшскай сталіцы, гульня ў адказ — 2 жніўня на полі «Барысаў-Арэны».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** lobazhevich@zviazda.by

# Абмежаваны доступ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Ніколі не будзе такога, каб усё насельніцтва перастала спажываць алкаголь, аднак асобныя мэтавыя групы зменяць свае паводзіны ў выніку тых мер, што прыняты і яшчэ будуць прымацца, — адзначае **намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Сяргей ОСІПЧЫК.** — Ва ўсім свеце прафілактыка алкагалізму праводзіцца па трох кірунках — папярэджванне, зніжэнне распаўсюджанасці, змяншэнне наступстваў з дапамогай рэабілітацыі. Адна з ключавых мер у зніжэнні алкагольнага спажывання — зніжэнне даступнасці. Каб знізіць даступнасць, неабходна абмежаваць прапанову і попыт.

Важным момантам тут будзе змяненне акцызнай палітыкі — акцыз на піва павінен быць меншым, а на 40-градусныя напоі большым. Варта нагадаць, што ў шэрагу еўрапейскіх краін моцны алкаголь прадаецца ў спецыялізаваных магазінах, у пэўны час. У звычайных харчовых магазінах ёсць толькі піва з колькасцю алкаголю 3 працэнты. Як вынік — у Швецыі, напрыклад, няма фактаў гібелі людзей у дарожна-транспартных здарэннях па прычыне знаходжання кіроўцы ў стане алкагольнага ап'янення, а затрыманні п'яных за рулём — адзінкавыя выпадкі. Суадносіны акцызаў на моцныя напоі і піва складаюць у скандынаўскіх краінах 1:16! А ў нас — 1:1,3. Польшча, якая пайшла ў гэтым сэнсе следам за Скандынавіяй, так паўплывала на структуру алкагольнага спажывання, што цяпер на моцны алкаголь прыпадае 30 працэнтаў, а на піва 70. Такі варыянт лічыцца ідэальным. Што характэрна, і бюджэт папаўняецца не горш, а тое і лепш, дый сацыяльна-медыцынскія наступствы спажывання становіцца менш.

Для таго каб паступленні ў бюджэт ад рэалізацыі алкаголю не зніжаліся, не рэкамендуецца павышаць акцызы рэзка, больш як на 30 працэнтаў за год. У Беларусі размова пакуль ідзе аб 5-працэнтным павелічэнні ў год, што будзе рэалізавана, хутчэй за ўсё, ужо налета. Паскорыць працэс немагчыма, бо давядзецца ўзгадняць пазіцыю з калегамі па ЕАЭС (дарэчы, краіны ЕС у гэтым сэнсе больш свабодна робяць падобныя крокі). Калі суадносіны атрымаюцца ў выніку ў нашай краіне, скажам, пакуль цяжка — хутчэй за ўсё, мы будзем мець на ўвазе польскі вопыт. Суседзям удалося захаваць бюджэт і змяніць структуру спажывання пры суадносінах 1:5.

### Ісціна — не ў віне...

— Што ёсць сёння наша культура спажывання алкаголю? Можна купіць бутэльку 40-градуснага напою і выпіць па дарозе дадому! Гэта недапушчальная сітуацыя, а таму грамадства трэба перавыхоўваць. Спажыванне алкаголю можа быць фонам для сустрэчы і стасункаў, а не сустрэча і стасункі — для спажывання алкаголю, — кажа Сяргей Іванавіч.

У кожным абласным цэнтры і Мінску на базе ўстаноў аховы здароўя працуюць стацыянарныя аддзяленні медыцынскай рэабілітацыі для пацыентаў з алкагольнай залежнасцю. Месцы там ёсць, а таму можна звяртацца па дапамогу, кансультацыю і самім залежным, і іх сваякам. Сацыяльная рэабілітацыя залежных арыентуецца на абавязковае працаўладкаванне, асабліва тых, хто вызваліўся з лячэбна-працоўных прафілакторыяў, куды накіроўваюцца правапарушальнікі з алкагольнай залежнасцю па рашэнні суда. Сярэдні тэрмін знаходжання ў такой установе, а іх сёння 8 па краіне, — 1 год. Прымусовае лячэнне прызначае таксама суд у адпаведнасці з крымінальным правам.

«Калі на працягу года ў стане алкагольнага ап'янення ўчыняюцца два правапарушэнні, то выносіцца афіцыйнае папярэджанне, — тлумачыць **в. а. на пасадзе начальніка аддзела арганізацыі работы ўчастковых інспектараў міліцыі ўпраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі Міністэрства ўнутраных спраў Вольга САКАЛОЎСКАЯ.** — Калі далей на працягу года пасля такога папярэджання ўчыняецца трэцяе правапарушэнне, то выносіцца рашэнне аб пастаноўцы на прафілактычны ўлік, што азначае пастаянны кантроль па месцы жыхарства, прыцягванне да розных прафілактычных мерапрыемстваў».

Нягледзячы на тое, што колькасць учыненых пад уздзеяннем алкаголю злачынстваў і правапарушэнняў паступова зніжаецца, кожнае чацвёртае злачынства ўсё ж такі ўчыняецца нападпітку. Са злоўжываннем звязана каля 80 працэнтаў цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў — забойстваў, грабяжоў, разбояў.

Якім бы даступным ні быў сёння легальны алкаголь, на вёсцы па-ранейшаму сустракаецца і нелегальны. Летась было канфіскавана 512 тысяч літраў самагону і самагоннай брагі, у незаконным абароце выяўлена каля 140 тысяч літраў алкагольнай прадукцыі. За незаконны абарот прыцягнуты да адказнасці каля 14 тысяч грамадзян.

Сёлета з нелегальнага абароту выведзена каля 800 тысяч літраў самагону, самагоннай брагі і алкаголю. Канфіскаваны ў момант «работы» 853 самагонныя апараты.

8,8 літра абсалютнага спірту прыпадала летась на душу насельніцтва ў нашай краіне. Гэта, безумоўна, паказчык продажу, а пра рэальнае спажыванне можна меркаваць па колькасці алкагольных псіхозаў і алкагольных цырозаў, якія, хоць і нязначна, але знізіліся ў апошнія гады.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** protas@zviazda.by

■ Ліст у рэдакцыю

# СПРАВЫ ВЯСЕЛЬНЫЯ



## Падаваць заяву ў ЗАГС за тры дні — позна?

**З праблемай звярнулася да нас мінчанка Алена Шуцько. «Пытанне ў мяне вельмі далікатнае, — піша яна. — Датычыцца шчаслівага стварэння маладой сям'і, якая ўжо на першых кроках да гэтага адчула неразуменне з боку работнікаў сталічнага Дома шлюбу».**
**Сын чытачкі сабраўся ажаніцца, але аказалася, што падаць заяву не так проста.**

Але пра ўсё па парадку. Не так даўно малодшы сын Алены Іосіфаўны, які вучыцца ў аспірантуры ў Германіі, зрабіў прапанову рукі і сэрца сваёй любай дзяўчыне. Дзеля гэтага ён на некалькі дзён прыляцеў з-за мяжы. Хлопец працуе ва ўніверсітэце ў горадзе Вуперталі: там аспірант абавязкова павінен працаваць. Адлучыцца з работы вельмі складана — пры ўмове згоды прафесара і толькі ў час водпуску.

Але ж хлопец неяк вырваўся, каб сустрэцца са сваёй будучай нявестай. Абмеркавалі дату вяселля — 22 верасня, пятніца. Па электроннай пошце папярэдне запісаліся. Рэгістрацыя шлюбу павінна адбыцца 22 верасня ў 11.20 у Доме шлюбу Мінгарвыканкама. «Сумесную заяву ў тэлефоннай размове ім прапанавалі напісаць пазней, таму што трэба, каб былі абое. А ў той час сын быў ужо ў Вуперталі», — тлумачыць дэталі Алена Шуцько.

У правілах аб тэрмінах падачы заявы ў ЗАГС пазначана, што сумесную заяву можна падаць за тры дні да даты шлюбу, а ў асаблівых выпадках — за дзень. Улічваючы, што колькасць дзён водпуску вельмі абмежаваная, сын чытачкі адразу ж па прыездзе аформіў адпачынак з 15 верасня. Да вяселля застаецца яшчэ тыдзень. Фармальна можна падаць заяву ў пятніцу ці суботу. Нават калі звярнуцца з заявай у аўторак (нядзеля і панядзелак у Доме шлюбу выхадныя), то да пятніцы якраз застаецца тры дні.

«Маладыя загадзя выбралі аўторак, — піша чытачка. — Аднак, каб быць больш упэўненай, нявеста вырашыла яшчэ раз удакладніць час падачы сумеснай заявы ў асабістай гутарцы са спецыялістам. Якое ж было здзіўленне, калі ёй сказалі, што аўторак — гэта ўжо позна, а ў пятніцу і суботу не прымуць, бо адбываецца рэгістрацыя шлюбаў. Адмовіліся нават паказаць залу, у якой будзе праходзіць рэгістрацыя. Сказалі, што фота ёсць на сайце, там і глядзіце. Але ж здымкі не заўсёды супадаюць з рэальнасцю».

Ці трэба казаць, што будучая нявеста ў роспачы. Пара перачытала ўжо законы: усё сыходзіцца, маладыя дзейнічаюць па правілах. Чаму тады ўзнікаюць перашкоды, здавалася б, на пустым месцы?

«У маёй маладосці ўсё не так было. Па-сапраўднаму для маладых былі адкрыты ўсе дарогі і дзверы, — дзеліцца набалелым Алена Іосіфаўна.

### У пятніцу і суботу спецыялісты занятыя

У Доме шлюбу Мінгарвыканкама расказалі, што падобных забарон у іх няма.

— Каб рэгістрацыя шлюбу адбылася ў пятніцу, падаць заяву ў аўторак таго ж тыдня можна. Якраз пройдзе тры дні, гэта не позна, — запэўніла **загадчыца ўстановы Юлія КОЧЫНА.**

Прыйсці з заявай у пятніцу ці суботу ў тэорыі таксама можна, але ёсць свае нюансы. «У гэтыя дні ў нас ідзе ўрачыстая рэгістрацыя шлюбаў. Усе спецыялісты занятыя. Таму мы і просім прыносіць дакументы ў аўторак ці сераду, каб людзям не прыйшлося чакаць гадзінудзве, пакуль хтосьці з супрацоўнікаў вызваліцца і зможа прыняць заяву», — растлумачыла Юлія Кочына.

Што да асаблівых выпадкаў, у якіх заяву можна падаць за дзень да роспісу, то да іх адносяць, напрыклад, цяжарнасць, пацверджаную даведкай, ці наяўнасць сумесных дзяцей.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ,**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Сто гадоў!

# «ЗВЯЗДА» — МАЯ СЯБРОЎКА І ДАРАДЧЫЦА



**«...У студзені 1945-га ў час начной атакі нямецкая куля прабіла мне правую нагу ніжэй калена. Быў моцны мароз, але ж баявыя таварышы адцягнулі мяне з поля бою, перадалі санітарам. Месяц я лячыўся ў Вільні, месяц — у Маскве, паўгода — у Казахстане.**

Са шпіталя ў родную вёску я вярнуўся ў 1946-м, інвалідам другой групы. Некалькі месяцаў працаваў сакратаром сельскага Савета. З многім тады прыходзілася сутыкацца, шмат што назіраць, пра асобнае хацелася напісаць, расказаць іншым. Свае нататкі я стаў дасылаць у раённую газету. Праз пэўны час мяне запрасілі туды на працу.

Але ж зараз не пра тое. Яшчэ з пяцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя я стаў пастаянна выпісваць, чытаць «Звязду» і супрацоўнічаць з ёй. У жніўні 1977-га маю працу нават адзначылі Ганаровай граматай, дзе ёсць такія словы: «Узнагароджваецца грамадскі карэспандэнт (*далей — прозвішча...*) за шматгадовае і плённае супрацоўніцтва і ў сувязі з 60-годдзем з дня выхаду першага нумара газеты «Звязда». Рэдактар — А. Тоўсцік».

Скажаце, што гэта было даўно, што многае з тых часоў змянілася? Але ж і... не змянілася таксама! Ва ўсякім разе, я ў свае амаль 92 па-ранейшаму выпісваю газету і бывае, што пішу ў рэдакцыю «Звязды». Мая жонка Марыя (светлай памяці!) супрацоўнічала з выданнем таксама: складала вершаваныя подпісы да здымкаў на конкурс «Хто каго?» А чыталі і чытаюць газету яшчэ і мой сын, нявестка, унучка...

Невялікі, на жаль, тыраж у «Звязды», забываюцца людзі матчыну мову. А таму перад стагоддзем газеты я шчыра жадаю, каб яе выпісвалі і падтрымлівалі дэпутаты, міністры, нашы чыноўнікі ды дзеячы культуры, людзі, з якіх бяруць прыклад іншыя. І тады — нават у новых пакаленняў чытачоў, як і ў нас, — будзе добрая сяброўка і дарадчыца ў «асобе» «Звязды».

**Міхаіл ЧАРНЯЎСКІ,**
**пехацінец, ветэран Вялікай Айчыннай вайны,**
*к. п. Нарач, Мядзельскі раён*

■ Свой погляд

# БЕЗ НАВУК, ЯК БЕЗ РУК

**Бягучы 2017-ы абвешчаны Годам навукі, і гэта нездарма, бо грэх недаацэньваць яе ролю ў сацыяльна-эканамічным развіцці, у вызначэнні найбольш эфектыўных відаў эканамічнай дзейнасці, кірункаў дэмаграфічнай і (у тым ліку...) міграцыйнай палітыкі, эфектыўнасці ўдзелу краіны ў інтэграцыйных аб'яднаннях ды інш.**

На нядаўнім Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі прагучаў, напрыклад, заклік перавесці нашу краіну на рэйкі інфармацыйных тэхналогій. Нават мне, кандыдату навук, асэнсаваць гэта досыць складана, бо найперш узнікае пытанне, а што ж будзе з традыцыйнымі для нас відамі эканамічнай дзейнасці, які лёс у іх? І потым: наколькі магчыма здзейсніць прарыў у IT-сферы пры такім сціплым фінансаванні навуковай дзейнасці (менш за 1% ад ВУПа Беларусі)? Ды яшчэ з улікам таго, што гэта ніша даўно занятая...

Нельга забывацца і пра колькасную абмежаванасць навуковага персаналу, які па ўсіх кірунках навуковай дзейнасці налічвае каля 30 тыс. чалавек. (Для параўнання заўважу, што ў меншых за Беларусь па колькасці насельніцтва Даніі, Швейцарыі, Швецыі ён у паўтара, а то і ў два разы большы.)

Магчыма, якраз гэтым, апошнім, фактам і абумоўлены некаторыя сумныя прыклады. Я, у прыватнасці, проста не разумею, што ў нас назіраецца пры будаўніцтве сучасных сеткавых гандлёвых цэнтраў. Нярэдкая ж сітуацыя, калі два такія аб'екты стаяць побач або проста адзін насупраць другога (Мінск, вул. Маякоўскага). І гэта пры тым, што ўжо сёння вядома: па забяспечанасці насельніцтва гандлёвай плошчай Беларусь перагнала шэраг еўрапейскіх краін. Тады які сэнс бяздумна «ляпіць» гэтых «гандлёвых монстраў»?

Безумоўна, у іх знойдуцца абаронцы, скажуць, што там прыватныя сродкі і як іх траціць, вырашае сам інвестар, да таго ж добра, што расце канкурэнцыя... Усё гэта так, але ж паралельна губляюцца неўзнаўляльныя зямельныя рэсурсы, аддаляецца ад спажыўца будаўніцтва іншых патрэбных яму аб'ектаў.

Ёсць пытанні і па больш грунтоўных збудаваннях, якія ўзводзіліся за кошт крэдытных рэсурсаў і сродкаў дзяржавы (а значыць, падаткаплацельшчыкаў). Узяць хоць бы эстакаду на аўтамагістралі М-4 Мінск — Магілёў паміж вёскамі Карзуны і Заполле. Заўважу, што абодва населеныя пункты не маленькія: у іх пражывае каля дзвюх тысяч жыхароў. Такім чынам, кожны дзень эстакаду адольваюць сотні чалавек, многія з ліку пенсіянераў ды інвалідаў. І можна ўявіць сабе, якім няпростым для чалавека сталага ўзросту, для дзяцей ды мам з малымі (асабліва ў зімовы перыяд) з'яўляецца пераадоленне вышыні ў дзесяць метраў (менавіта столькі ад падэшвы дарогі да эстакады)... Ну а праводзіць у апошні шлях жыхара Заполля і наогул праблема, бо, каб дабрацца на могілкі ў г. п. Смілавічы, трэба, як той казаў, «выпісаць кругаля» ў 5 кіламетраў. Акурат такія ж кругі наразаюць кіроўцы, якім трэба трапіць з Мінска ў Заполле і са Смілавічаў у Карзуны.

Гэта, калі можна так сказаць, сацыяльны аспект праблемы. А ёсць жа яшчэ і эканамічны. Асноўная частка сельскагаспадарчых зямель СВК «Запольскі», яго жывёлагадоўчыя фермы размешчаны на другім баку аўтамагістралі М-4. У выніку для таго, каб на трактарах і аўтамабілях даехаць да адпаведных аб'ектаў, кожны дзень спальваюцца сотні літраў «лішняга» паліва, марнуецца час.

Лагічнае пытанне: куды глядзелі навукоўцы-праектанты і мясцовыя органы ўлады? Чаму яны бачылі толькі перавагі хуткаснага рэжыму, які, вядома ж, забяспечыла эстакада.

Яшчэ адна праблема. У апошнія гады назіраецца наша імкненне будаваць розныя аб'екты на тэрыторыі іншых краін. Безумоўна, Беларусі неабходна прасоўваць сваю прадукцыю на замежныя рынкі, каб зарабіць валютныя сродкі, аднак нельга забывацца і пра сваіх людзей, якія трапляюць у сумна вядомыя спісы ўтрыманцаў — найчасцей з-за адсутнасці працоўных месцаў.

Лічу, што сёння навукоўцам (найперш эканамістам, географам, дэмографам, эколагам) трэба ўшчыльную заняцца глыбокім вывучэннем усіх рэгіёнаў краіны і прапанаваць ураду, кіраўнікам мясцовых органаў улады спіс населеных пунктаў і вытворчасцяў, найбольш прыдатных для развіцця. Перакананы, што ў такіх складаных пытаннях без навукі не абысціся. Будуць слушныя прапановы з боку навукоўцаў — з'явіцца запатрабаванасць у іх дапамозе з боку чыноўнікаў. Старшыня Магілёўскага аблвыканкама спадар Даманеўскі выказаўся наконт гэтага адназначна: «У Беларусі неабходна распрацаваць праграму раўнамернага развіцця рэгіёнаў: у краіне пакуль няма адзінай палітыкі і канцэпцыі перспектыўнага развіцця рэгіёнаў. З-за гэтага адбываецца дысбаланс у фінансаванні і развіцці асобных тэрыторый. Таму патрэбен збалансаваны падыход па размеркаванні бюджэтных рэсурсаў, дакладная расстаноўка прыярытэтных кірункаў і тэрыторый развіцця, пераход да больш актыўнай рэгіянальнай палітыкі... Толькі так мы зможам прыцягваць сюды інвестараў і бізнес, ствараць новыя працоўныя месцы, развіваць сацыяльную сферу і павышаць узровень жыцця насельніцтва» («Звязда», 29 сакавіка г. г.).

Як навуковец, які пражыў больш за 60 гадоў, магу ўпэўнена сцвярджаць: тое, што здаецца сёння правільным ці, кажучы навуковай мовай, аптымальным, праз пэўны час можа выглядаць зусім інакш. Хуткае развіццё грамадства, змены ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці патрабуюць не толькі аператыўных, але і кваліфікаваных, адказных рашэнняў. Ні ў якім разе нельга забывацца аб тым, што памылкі пры стварэнні любых гаспадарчых аб'ектаў не выпраўляюцца, а жорстка караюцца праз неабходнасць губляць сродкі на новае будаўніцтва альбо рэканструкцыю.

**Вячаслаў САСНОЎСКІ, дацэнт, кандыдат геаграфічных навук,**
*г. Мінск*

■ Пасля пісьма

# «АДНАВІЦЬ СЯДЗІБУ ДАСТАЕЎСКІХ»? СПРАВА ГОНАРУ!

**Паважаная, можна сказаць, родная мне «Звязда»! Спяшаюся падзяліцца з табой, з чытачамі газеты радаснай навіной: у Беларусі, у нашым Іванаўскім раёне, да 200-годдзя з дня нараджэння Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага, дасць бог, з'явіцца музей генія сусветнай літаратуры.**

А пачыналася ўсё з таго, што 30 студзеня 2014 г. «Звязда» апублікавала мой ліст пад назвай «Аднавіць сядзібу Дастаеўскіх». У ім я прапаноўваў звярнуцца да кіраўніцтва Саюзнай дзяржавы з хадайніцтвам аб выдзяленні сродкаў на ўшанаванне памяці, пісаў аб тым, што іх не так многа і трэба, бо архітэктурны праект і падрабязнае апісанне радавога гнязда пісьменніка ёсць у досыць багатым школьным музеі ў Дастоеўскай сярэдняй школе. Да таго ж дом быў драўляны, калодзеж і агароджа таксама...

Гэтую публікацыю рэдакцыя накіравала на разгляд у Міністэрства культуры, яно ў сваю чаргу зрабіла хадайніцтва ў кіраўніцтва Саюзнай дзяржавы і сродкі на музей знайшліся. Цяпер задача ў тым, каб своечасова і якасна распарадзіцца імі — скарыстаць па прызначэнні.

...Так сталася, што Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага лепш ведаюць на Захадзе, чым у сябе на радзіме. А таму ўпэўнены, што турыстычны маршрут да сядзібы генія стане адным з самых папулярных у нашай краіне, ад чаго і мы самі адчуем яшчэ большы гонар за свайго знакамітага земляка.

**Леанід Якаўлевіч СЯНЮТА,** *г. Мінск*

■ Дзякуй!

# СТАРЫЯ «КАЗКІ» БЫЛІ НЕ ГОРШЫЯ

**Лета — час адпачынку, час падарожжаў, сустрэч... І наша сям'я ў гэтым не выключэнне. Надоечы ў госці да мяне сабраліся ўнукі, загадзя заказалі дранікі і наш любімы торт.**

«Казку» наша сям'я ўпадабала даўно: яна, можна сказаць, нязменна ўпрыгожвала любыя нашы ўрачыстасці.

Здавалася, што і зараз праблемы з тортам не будзе. Але ж дзе там: крамы з кандытарскімі вырабамі прапаноўвалі «Казку», ад якой з ранейшых часоў засталася, відаць, толькі назва. Мне тлумачылі, што змянілася рэцэптура, што яна, новая, дазваляе павялічыць тэрмін прыдатнасці, то-бок захоўваць торт больш працяглы час... Але ж я і мае ўнукі марылі ўбачыць на стале даўнейшую «Казку» — бела-ружовую, з кветкамі і грыбочкамі, з сапраўдным масляным крэмам. І мы не збіраліся яе «захоўваць»...

Акурат такі торт і, можна сказаць, нарэшце я знайшла на праспекце Незалежнасці ў краме-кавярні: сапраўдную, ранейшую, а дакладней класічную, «Казку» вырабляе кандытарскі цэх хлебазавода №3 КУП «Мінскхлебпрам». А таму і я, і ўсе мае госці вельмі ўдзячны гэтаму калектыву, людзям, якія, ну напэўна ж, выпускаючы нешта новае, захоўваюць і старыя рэцэпты нашых фірменных ласункаў.

**А. БАЛОШКА,** *г. Заслаўе*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

20 ЛІПЕНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№14 (15821)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

Гурт «MILKI»:

# «У дзявочым калектыве заўсёды ёсць канкурэнцыя»



Першы склад гурта «MILKI», які ўдзельнічаў у нацыянальным адборы «Еўрабачання»: злева направа Марына Путнікава, Вікторыя Назарка, Таццяна Стахоўская, Таісія Серыкава і Ганна Рай.

**Тры гады таму яны прайшлі кастынг у гурт, які збіраў на сваёй радзіме нарвежскі спявак і музыкант Аляксандр Рыбак. І ўжо праз некалькі месяцаў выступалі на нацыянальным адборы на «Еўрабачанне». Якімі творчымі праектамі займаецца сёння гурт «MILKI», ці ёсць канкурэнцыя ў дзявочым калектыве і наколькі атрымліваецца сумяшчаць сцэну і асабістае жыццё, «Чырвонцы. Чырвонай змене» расказалі Таісія Серыкава, Марына Путнікава, Таццяна Стахоўская і Дана Іголка.**

***— Чым займаліся да таго, як трапіць у гурт? Як даведаліся пра кастынг?***

**Тая:** — Аб кастынгу мне расказала мая калега з музычнай школы, дзе я тады працавала выкладчыкам па эстрадным вакале. У сацыяльнай сетцы яна ўбачыла відэа Аляксандра Рыбака, у якім ён прапаноўваў паспрабаваць свае сілы і паўдзельнічаць у адборы. Падумала, што мне гэта можа быць цікава...

**Марына:** — На той момант я толькі скончыла каледж і выкладала ў вакальна-харавой школе ў Горках. Пра кастынг мне расказалі бацькі майго маладога чалавека.

**Дана:** — Да прыходу ў гурт і сёння я вучуся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Пра кастынг даведалася са СМІ. Але адбор праходзіла не з усімі, бо на той момант мне яшчэ не было 18 гадоў. У гурт я трапіла пазней. Дзяўчаты і Аляксандр прынялі мяне вельмі прыязна.

**Таня:** — Мне пра кастынг расказаў добры знаёмы. Сказаў, што там, у гурце, маё месца.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

*Шлях чэмпіёна*

# КАЛІ ЖАЛЕЗА СКАРАЕЦЦА ДУХУ

**Дваццацідзевяцігадовы Аляксандр КОДЗІС з Гродна ставіць сусветныя рэкорды і здзіўляе ўсіх сваёй настойлівасцю на шляху да перамогі.**

Сямігадовым хлопчыкам падчас гульні з братам ён траўміраваў левае вока і стаў інвалідам па зроку. Іншыя ў такіх сітуацыях ламаюцца, але Аляксандр не з такіх. Убачыўшы ў адным з часопісаў фота знакамітага «караля» бодзібілдынга, хлапчук таксама вырашыў стаць чэмпіёнам. Але шлях у вялікі спорт атрымаўся цярністы.

Спачатку ён спрабаваў сябе ў лёгкай атлетыцы, плаванні, класічным і тайскім боксе. Некаторы час займаўся кросфітам. На ўсіх трэніроўках працаваў да сёмага поту, але з розных прычын кожны раз даводзілася пераключацца з аднаго віду спорту на другі. Ад чагосьці Аляксандр адмовіўся з-за праблем са зрокам, нешта проста не давала жаданых вынікаў.

Але ад сваёй мары хлопец не адмовіўся. Па парадзе сябра два гады таму ён прыйшоў у паўэрліфтынг і адразу гучна заявіў пра сябе. На першым жа турніры пабіў рэкорд Беларусі ў станавой цязе і выканаў норматыў майстра спорту. Яшчэ праз пару месяцаў атрымаў званне майстра спорту міжнароднага класа. А летась выйграў Адкрыты кубак Беларусі і ўстанавіў сусветны рэкорд у суме — 337,5 кілаграма.

— Мама заўсёды плача, калі я падымаю штангу. Яна катэгарычна супраць паўэрліфтынга, але даўно перастала прасіць мяне кінуць спорт, — кажа Аляксандр.

***— З чаго пачалася твая кар'ера ў спорце?***

— Колькі сябе памятаю, заўсёды марыў стаць падобным на спартсменаў з ілюстраванага часопіса «Sigma». Нават не ведаю, адкуль ён узяўся ў нашым доме, але фатаграфіі культурыстаў, перш за ўсё «жалезнага» Арнольда Шварцэнэгера, назаўжды ўрэзаліся ў маю памяць. У дзяцінстве я вырашыў: калі вырасту, абавязкова стану такім жа вялікім і моцным, як ён.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)***




Хлопец марыць стаць абсалютным чэмпіёнам свету.

*Працоўнае лета*

# НЕ ЎМЕЕШ ТАНЦАВАЦЬ — НЕ ВАЖАТЫ

## АДЗІН ДЗЕНЬ У ПЕДАГАГІЧНЫМ АТРАДЗЕ



Фота Надзеі БУЖАН.

Старшы педагог Уладзімір Самуленкаў вітае атрад.

**Калі вельмі хочацца ў дзіцячы лагер, а пуцёўкі з-за ўзросту ўжо не прадаюць, можна запісацца ў важатыя. Каб трапіць у педагагічны атрад, некаторыя адмаўляюцца ад паездак на мора і выгадных кантрактаў. А што набываюць узамен? Пра гэта мы даведаліся ў моладзі з педатрада «Ветразь», які працуе на базе аздараўленчага лагера «Спадарожнік».**

## АСАБІСТЫ ПРЫКЛАД ВА ЎСІМ

Педатрад «Ветразь» працуе ўжо васямнаццаты год. У яго шэрагах не толькі будучыя педагогі: стаць важатым можа прадстаўнік любога ўніверсітэта. Вядома, пасля таго як пройдзе адбор.

— Сёлета да нас на гутарку прыйшло 240 чалавек. З іх мы пакінулі на навучанне дзесьці 140, а да канца дайшло 120. У асноўным гэта студэнты і маладыя спецыялісты. Сярэдні ўзрост — 23 гады, — расказвае **старшы педагог атрада «Ветразь» Уладзімір САМУЛЕНКАЎ.**

Навучанне будучых важатых праходзіць з лютага да мая і складаецца з некалькіх этапаў. Першы — дыстанцыйны. Ён арганізуецца па прынцыпе «роўны навучае роўнага»: досведам з навічкамі дзеляцца вопытныя важатыя. Прапануюцца заданні на камунікабельнасць, вызначэнне зоны камфорту. Другі этап — вочны: трэнінгі і майстар-класы ладзяцца на базе Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

*Факт*

## БЕЗ ПРОМАХАЎ

**Чатыры медалі заваявалі на 49-й Міжнароднай алімпіядзе па хіміі, якая завяршылася ў Тайландзе, беларускія школьнікі.**

З сярэбранымі ўзнагародамі вярнуліся на радзіму выхаванка Ліцэя БДУ Паліна Булаўская, вучань бабруйскай гімназіі №2 Аляксей Харлап і Аляксей Гарохаўскі (мінская гімназія №29). Бронзавы медаль — у выпускніка Ліцэя БДУ Рамана Мазура.

У Тайландзе спаборнічалі старшакласнікі з 76 краін свету. Школьнікі разыгралі паміж сабой 36 залатых, 65 сярэбраных і 95 бронзавых медалёў.

Па ўмовах алімпіяды, кожную краіну можа прадстаўляць каманда, у якую ўваходзяць не больш за чатыры школьнікі і два педагогі. Алімпіяда складаецца з двух выпрабаванняў: тэарэтычнага і практычнага. Абодва доўжацца да 5 гадзін і праводзяцца ў розныя дні.

## ПЕДАГОГАЎ ЗАЦІКАВЯЦЬ У ПЛАТНЫХ ПАСЛУГАХ

**У кіраўнікоў устаноў адукацыі з'явілася магчымасць павышэння аплаты працы педагогаў за кошт пазабюджэтных сродкаў.**

Урадам прынята пастанова ад 14 ліпеня №530 «Аб некаторых пытаннях аплаты працы педагагічных работнікаў за кошт пазабюджэтных сродкаў ад дзейнасці, якая прыносіць даходы».

У адпаведнасці з дакументам установа адукацыі пры рэалізацыі праграм дадатковай адукацыі на платнай аснове мае права павялічваць педагогам, якія ўдзельнічаюць у прадастаўленні гэтых паслуг, тарыфную стаўку першага разраду за кошт атрыманых пазабюджэтных сродкаў, але не больш чым у два разы. Памер тарыфнай стаўкі ўстанова адукацыі павінна ўзгадніць з дзяржорганам, у падпарадкаванні якога яна знаходзіцца. Крыніцай для выплаты заработнай платы ў гэтым выпадку з'яўляюцца толькі зароблены пазабюджэтныя сродкі.

Пералік праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і праграм дадатковай адукацыі дарослых вызначаны Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## СПЕЦЫЯЛІСТЫ ДЛЯ ІТ-КРАІНЫ

**Новая спецыяльнасць «праектаванне складаных інтэграваных сістэм» адкрываецца ў магістратуры Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ.**

Ініцыятарамі яе стварэння выступілі загадчык кафедры тэхналогій праграмавання ФПМІ БДУ Аляксандр Курбацкі і загадчык кафедры тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій Юрый Варатніцкі. Да гэтага часу падрыхтоўка спецыялістаў у галіне канцэптуальнага праектавання складаных інтэграваных сістэм у Беларусі не ажыццяўлялася. Адкрыццё новай спецыяльнасці абумоўлена яе запатрабаванасцю на рынку працы.

Адкрыццё новай спецыяльнасці — гэта пілотны праект, у рамках якога адпрацоўваюцца новыя падыходы ў падрыхтоўцы спецыялістаў для ІТ-сферы, якія эфектыўна спалучаюць тэорыю і практыку. Актуальныя для галіны навучальныя планы і праграмы распрацоўваліся ў цесным узаемадзеянні з работадаўцамі — рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій. Падрыхтоўкай вострапатрабаваных кадраў зоймуцца спецыялісты вядомых ІТ-кампаній, якія раней абаранілі дысертацыі ў БДУ.

Прыём дакументаў на новую спецыяльнасць будзе весціся з 1 па 24 жніўня.

## ХІНДЗІ — ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ

**Курсы па вывучэнні мовы хіндзі ўпершыню адкрываюцца ў БДУ. Заняткі стартуюць 1 верасня. Праходзіць яны будуць у фармаце факультатыва ў вячэрні час два разы на тыдзень.**

За аснову вывучэння мовы ўзяты курс, распрацаваны расійскімі лінгвістамі Залманам Дымшыцам і Алегам Ульцыфіравым. Курсы ў БДУ арганізаваны пры падтрымцы пасольства Індыі ў Рэспубліцы Беларусь. Заняткі будзе весці супрацоўнік кафедры моваведства і краіназнаўства Усходу факультэта міжнародных адносін БДУ Анастасія Буланкова. Да навучальнага працэсу будуць прыцягвацца і носьбіты мовы. Навучанне на курсах бясплатнае.

Запісацца на курсы можна па тэлефонах 8 (044) 72 413 72 або 8 (017) 209 57 74.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Праект, які аб'ядноўвае*

# Каб вучыць нашу мову родную...

## ...ДА НАС ЕДУЦЬ З УСЯГО СВЕТУ

**Пяць дзясяткаў студэнтаў усіх узростаў з розных краін — ад ЗША да Японіі — на два тыдні запоўнілі аўдыторыі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы БДУ. Нягледзячы на тое, што ўсе яны прадстаўлялі такія розныя культуры, агульнай для ўсіх стала беларуская мова. Менавіта дзеля яе вывучэння яны і прыехалі ў Мінск. Міжнародная летняя школа беларусістыкі — унікальны праект, які дазваляе пагрузіць замежнікаў у айчынны кантэкст. Карэспандэнты «Чырвонкі. Чырвонай змены» завіталі ў школу, каб даведацца, што прывабіла іх у нашай краіне.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Калі ўжо натхняцца беларускай культурай, дык ва ўсіх аспектах.**

У адной з аўдыторый праходзяць чарговыя заняткі школы. Студэнты займаюцца быццам бы не самай складанай справай, знаёмай кожнаму з дзяцінства, — алоўкамі расфарбоўваюць чорна-белыя малюнкі. З аднаго боку, гэта неблагі адпачынак на перапынку падчас вывучэння беларускай мовы, але не ўсё так проста... Пазней кожны са студэнтаў раскажа, якія колеры абраў для свайго малюнка, а гэта выдатны спосаб бліжэй пазнаёміцца з лексікай. Атмасфера на занятках пануе вясёлая і сяброўская. Калі лексічнага запасу беларускай мовы не хапае, на дапамогу прыходзіць англійская.

**Навучанне ў школе дапускае пэўную імправізацыю — пасля майстар-класа па беларускіх спевах група студэнтаў па ўласнай ініцыятыве адправілася ў тэатр.**

— Гэта так званая група «А» — студэнты, якія прыехалі з абсалютна нулявым узроўнем ведання беларускай мовы, — расказвае **выкладчык БДУ, кандыдат філалагічных навук Надзея ШАКУН.** — Хоць, вядома, гэты «нуль» у кожнага розны. Калі немцы, шведы ці японцы сапраўды напачатку не разумелі нічога па-беларуску, то студэнты з іншых славянскіх краін (скажам, Польшчы ці Славакіі) маюць пэўны пасіўны ўзровень — часткова разумеюць лексіку, лёгка асвойваюць граматыку. Для іх навучанне праходзіць прасцей і хутчэй.

**Эва БАХМІНЬСКА** родам з Польшчы, цяпер жыве ў Амерыцы і выкладае ў Карнэльскім універсітэце польскую мову і гісторыю кінематографа для студэнтаў. Цікавіцца культурай краін Усходняй Еўропы, добра гаворыць па-англійску, па-нямецку і па-руску. Цяпер у яе багажы з'явілася і беларуская мова — дзяўчына літаральна праз тыдзень ужо няблага размаўляе на самыя розныя тэмы, хоць часам у маўленні «праскокваюць» рускія ці польскія словы.

Пасля заняткаў усе збіраюцца на кава-паўзу — тут можна падзяліцца апошнімі ўражаннямі і проста пагутарыць (вядома, па-беларуску) не толькі з іншымі студэнтамі, але і з носьбітамі беларускай мовы — навучэнцаў школы суправаджаюць валанцёры з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, БДПУ, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. За кожнай ВНУ замацавана пэўная група студэнтаў. У сярэднім штодзень тут працуе 10—15 валанцёраў, але ніякага прымусу няма — усе прыходзяць па ўласным жаданні.

— На школу беларусістыкі найлепшых студэнтаў у якасці валанцёраў запрасіла наша выкладчыца беларускай мовы, — падзялілася **студэнтка трэцяга курса перакладчыцкага факультэта МДЛУ Анастасія САЎКОВА.** — Наша задача — заўсёды быць побач з замежнікамі, тлумачыць ім усё, што можа аказацца незразумелым. Калі казаць коратка — праводзім з імі ўвесь час, ад раніцы да вечара: суправаджаем у паездках і на экскурсіях, кансультуем, распавядаем пра Беларусь, дапамагаем рабіць дамашнія заданні, проста кантактуем. Мы адказваем за гасцей з Японіі, Швецыі, Славакіі, Чэхіі і Сербіі. Асабіста я найбольш кантактую з японцамі, бо ведаю японскую мову, і гэта для мяне дадатковая магчымасць папрактыкавацца. А ўвогуле, усе яны цікавыя, з кожным ёсць аб чым паразмаўляць. Я была валанцёрам на мінулагодняй школе, у мяне засталося шмат сяброў, са многімі дагэтуль падтрымліваю кантакты. А яшчэ гэта выдатная магчымасць паглядзець на нашу краіну вачыма замежнікаў...

Усе студэнты прыязджаюць у Беларусь за ўласныя сродкі. Але ўдзельнікі праекта атрымалі бясплатныя візы, адукацыйная і культурная праграмы для іх таксама нічога не каштавалі. І па астатніх аспектах ёсць прэферэнцыі: таннае пражыванне ў інтэрнаце РІВШ, харчаванне ў сталовай Акадэміі кіравання па дэмакратычных цэнах.

— Я родам з Японіі, нарадзіўся ў Токіа, — расказвае **студэнт школы беларусістыкі Юсукэ СУМІ.** — А ў Беларусь прыехаў з Румыніі. Працую там асістэнтам у Бухарэсцкім універсітэце на кафедры венгерскіх даследаванняў, іўрыту і румынскай мовы. Чатыры гады таму падчас вучобы ў Венгрыі крыху пазнаёміўся з беларускай мовай. Пасля прыезду



**Юсукэ Сумі (на здымку справа) зацікавіўся нашай мовай у... Венгрыі.**

у вашу краіну ў якасці турыста, мне вельмі спадабалася, і я захацеў вярнуцца. Калі даведаўся пра школу беларусістыкі, зразумеў, што нельга ўпускаць такі шанц. Чым Беларусь цікавая для японца? Насамрэч, гэта залежыць ад абставін. Напрыклад, я захапіўся вашай культурай дзякуючы выкладчыцы беларускай мовы, у якой навучаўся ў Венгрыі.

Заняткі ў школе для ўсіх студэнтаў пачыналіся аднолькава — з вечара знаёмстваў, калі ўсе расказвалі пра свае краіны пры дапамозе прэзэнтацый, спеваў і, вядома, традыцыйнай кухні. Далей удзельнікаў праекта чакала насычаная праграма, у якую ўваходзілі ўдзел у святкаванні Дня Незалежнасці, шматлікія экскурсіі ў разнастайныя музеі краіны, напрыклад, у музей народнай архітэктуры і быту ў вёсцы Строчыцы, экскурсія ў старажытны Полацк. Рашэнне аб удзеле кожны прымаў самастойна — калі некаму са студэнтаў мерапрыемства падавалася нецікавым, ён мог знайсці для сябе іншы занятак на гэты час. Увогуле, навучанне ў школе дапускае пэўную імправізацыю — валанцёры расказваюць, як пасля майстар-класа па беларускіх спевах група студэнтаў па ўласнай ініцыятыве адправілася ў тэатр, бо вельмі хацела патрапіць на адзін са спектакляў.

— Я пачаў вывучаць вашу мову ў сябе ў Венгрыі, бо ў нас ва ўніверсітэце працавала выкладчыца з Брэста, — падзяліўся **журналіст Матэ УР.** — Вучыўся на факультэце рускай філалогіі і славянскіх моў, але пасля той сустрэчы вырашыў вывучаць і беларускую. Вядома, хацелася трапіць у Беларусь, таму школа мне моцна дапамагла. Зразумела, венгру няпроста вывучаць беларускую, бо нашы мовы дастаткова далёкія, але я ўжо размаўляю па-руску, таму мне было прасцей. Што самае складанае? Напэўна, пісьмо. А яшчэ надзвычай цяжка разабрацца са скланеннямі. Калі казаць пра мае ўражанні, то мне ў вас падабаецца. Мяне цікавіць Усходняя Еўропа, я некалькі разоў быў у Расіі і, шчыра кажучы, думаў, што Беларусь не надта ад яе адрозніваецца. Але цяпер упэўнена магу сказаць, што гэта ўнікальная краіна, не падобная да іншых у гэтым рэгіёне. Я кажу і пра культуру, і пра мову, і пра іншыя аспекты. Што запомнілася? Паездка на радзіму Купалы ў Вязынку, дзе мы каштавалі дранікі!

Усяго праз тыдзень заняткаў большасць студэнтаў даволі нядрэнна размаўляе па-беларуску. **Іспанец Хаймэ ГАРСІЯ ТАБАРА** ў веданні мовы, пэўна, дасць рады і многім беларусам — хлопец гаворыць проста выдатна, здаецца, выдаць яго можа толькі акцэнт.

— Я жыву ў Мадрыдзе, беларускую і рускую мову пачаў вывучаць некалькі гадоў таму, — расказаў **студэнт універсітэта Альфонса Х Эль Сабіа.** — Раней кантактаваў з украінскай дыяспарай, пасябраваў з дзяўчынай-украінкай, якая мне расказала пра суполку беларусаў у сталіцы Іспаніі. Яны ладзілі літаратурную вечарыну з нагоды дня нараджэння Максіма Багдановіча. Я, вядома, завітаў туды, пазнаёміўся з супрацоўнікам беларускага пасольства, які і запрасіў у школу. Што мяне цікавіць у беларускай мове? Як ні дзіўна, тое, што яна малавядомая. Няма іспанска-беларускіх слоўнікаў, няма падручнікаў. Хоць я не першы іспанец, які займаецца гэтай тэмай. Ёсць Анхела Эспіноса, якая пераклала на іспанскую мову зборнік вершаў Багдановіча, ёсць Крысціян Рансэра, які вывучае беларускія гаворкі Палесся. Мне таксама хацелася б зрабіць штосьці карыснае, напрыклад, скласці першы іспанска-беларускі слоўнік — гэта стала б важным крокам, што дазволіў бы адкрыць Беларусь для людзей, якія гавораць па-іспанску.

Графік у школе дастаткова насычаны — штодзень абавязкова двое практычных заняткаў і адна ці дзве лекцыі з перапынкам на каву. Пасля — абед, адукацыйныя паездкі ды мерапрыемствы і вольны час, якім кожны карыстаецца па-свойму: нехта робіць дамашнія заданні, а нехта адпраўляецца на шпацыр па Мінску.

— Сёлета да нас першапачаткова паступіла больш як 100 заявак, — пракаментавала **выкладчыца і арганізатар Міжнароднай летняй школы беларусістыкі Наталля КЛІШЭВІЧ.** — Але колькасць месцаў была абмежаваная, таму, на жаль, трапіць у Мінск змаглі не ўсе ахвотныя. Праводзілі адбор, напрыклад, адсейвалі кандыдатаў, што ўжо ўдзельнічалі ў гэтым праекце раней. Некаторыя нават самі саступалі свае месцы «навічкам». Безумоўна, хочацца, каб школа пашыралася, але для гэтага трэба дадатковае фінансаванне, магчыма, спонсарскае. Нам вельмі дапамагаюць валанцёры. Летась у групе пачаткоўцаў нашы студэнты выконвалі ролю перакладчыкаў, думаю, гэта быў карысны досвед і для іх саміх. За апошнія гады тут сфарміравалася суполка людзей, якія любяць гэту справу і добра яе ведаюць.

Па словах Наталлі Клішэвіч, цяпер вядзецца распрацоўка адукацыйнага стандарту па навучанні беларускай мове як замежнай. Задача-максімум — ужо праз год ці два мець распрацаваныя падручнікі і дапаможнікі для навучання замежнікаў беларускай мове.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

*Разам — можам!*

# Збіраем «Чамадан дабра»

**Не так даўно на прасторах інтэрнэту з'явіўся новы праект «Чамадан дабра». Яго арганізатары — моладзь. Яны зусім розныя знешне, з рознай адукацыяй і ладам жыцця, але ёсць тое, што іх аб'ядноўвае: аніматар Раман Навасельскі, будаўнік Настасся Бяляева і электратэхнік Аляксей Максімаў робяць свет крышачку дабрэйшым.**

«Чамадан дабра» — гэта праект, створаны для таго, каб матываваць людзей рабіць карысныя і добрыя рэчы. Раман — стваральнік і асноўны ініцыятар ідэі. Ён займаецца пошукам герояў для роліка, думае над канцэпцыяй, кіруе суполкай «Чамадана дабра» ў сацыяльных сетках. Аляксей — відэааператар праекта. Усё, што датычыцца здымак, якасці карцінкі, — справа яго рук. Настасся прыцягвае да праекта людзей, дзеліцца сваімі ідэямі, дапамагае Раману.

Моладзь знаходзіць ахвотных зрабіць добрую справу. Сумесна яны прыдумляюць нешта карыснае і ажыццяўляюць гэта. У суполцы ёсць той самы сапраўдны жоўты «Чамадан дабра». Атрымаўшы яго, чалавек абавязкова робіць нешта карыснае для іншых. Напрыклад, калі ён аказаўся ў хлопца-танцора, той правёў майстар-клас па Jazz Funk. Усе сабраныя грошы адвезлі ў дзіцячы дом. Аляксей здымае ўсё, што адбываецца, на камеру і выкладвае ў інтэрнэт. Гледачы каментуюць, ацэньваюць выпуск і плануюць уласныя добрыя ўчынкі.

Нярэдка пасля чарговага выпуску з героямі «Чамадана дабра» Раману прыходзяць лісты пра тое, на якія добрыя справы натхніў кагосьці праект. Напрыклад, пасля здымак з Вікторыяй Аквінскай (дзяўчына падарыла рукавіцы бабулі, якая стаяла на вуліцы) глядач таксама зрабіў дабрачынны крок.

Ідэя стварыць праект прыйшла да Рамана ў цягніку. Ён часта падарожнічае. Падчас адной з такіх паездак хлопец даведаўся, што існуе нейкая скрынка з гарбатай, якая перадаецца з рук у рукі. Кожны кладзе туды пакецік з заваркай і перадае далей. Тады і з'явілася ідэя зрабіць «Чамадан дабра». Праекту ўсяго менш за год. Але за гэты час яго канцэпцыя змянялася неаднойчы:

— Спачатку мы хацелі паставіць чамадан на вуліцы, прапанаваць людзям рабіць добрыя справы, здымаць гэта на відэакамеру і выкладваць на ўказаны электронны адрас. Потым прыйшла ідэя перадаваць чамадан ад аднаго чалавека да іншага. Цяпер гэтым сталі займацца мы, так зручней.

Суполка моладзі не атрымлівае за сваю працу ніякіх грашовых узнагароджванняў. Хутчэй наадварот — яны робяць усё за асабістыя зберажэнні. Відэааператар Аляксей прыносіць на здымкі ўласную камеру, манціруе на ўласным камп'ютары. І гэта толькі фінансавы бок. Што ўжо казаць пра выдаткаваны на праект час?

— Часам я тэлефаную Лёшу ў дзве гадзіны ночы, каб сказаць: «Графік змяніўся. Здымаем заўтра замест абяцанага чацвярга». І ён падладжваецца, знаходзіць час.

Праект яшчэ зусім малады, таму цяжка сказаць, што больш за ўсё запомнілася. Аднак, як кажа каманда, кожны выпуск асаблівы. Памятаюць, як пераапраналі аднаго з удзельнікаў у касцюм Чабурашкі, як ехалі ў метро з яркім жоўтым чамаданам, як прыбіралі лес. Людзі па-рознаму рэагуюць на дабро, якое ім робіш. Нехта не разумее, што адбываецца, шукае падвох ці адмаўляецца ад дапамогі. Нягледзячы на гэта, суполцы маладых людзей падабаецца рабіць сваю справу. «Мы займаліся б гэтым кожны дзень, калі б не фінансавы бок, зарабляць жа на жыццё трэба».

Цяпер у каманды 14 гатовых выпускаў. Магло быць больш, калі б не асноўная работа. Акрамя таго, куды б ні ездзіў Раман, ён заўсёды бярэ з сабой «Чамадан дабра». Расказвае новым знаёмым аб праекце, прыцягвае да сябе ў каманду. Такім чынам праводзіць рэкламу, бо нават у сацыяльных сетках такія паслугі часцей за ўсё платныя:

— Нам пішуць: калі хочаце мець піяр на вялікіх сацыяльных пляцоўках, плаціце. На жаль, мы сабе гэтага дазволіць не можам.

На пытанне, колькі яшчэ будзе існаваць «Чамадан дабра», моладзь кажа:

— Гэта пытанне з разраду, колькі яшчэ людзей здольныя рабіць добрыя справы. Пакуль будуць рабіць, мы будзем здымаць.

Праект "Чамадан дабра" развіваецца і набірае абароты. Маладыя людзі вучацца на сваіх памылках, удасканальваюць канцэпцыю, прыцягваюць новых людзей. Пра тое, што праект не згасне, сведчыць цікавасць з боку гледачоў, арыгінальнасць ідэі і шмат энтузіязму ў вачах каманды.

За дзейнасцю «Чамадана дабра» вы можаце сачыць у аднайменнай суполцы «УКантакце» альбо на асабістых сацыяльных старонках Рамана Навасельскага.

**Наталля ТЫЧКО, студэнтка II курса Інстытута журналістыкі БДУ.**




**Злева направа: Аляксей Максімаў, Настасся Бяляева, Раман Навасельскі.**



**Адзін з удзельнікаў праекта Вадзім Ванюхоў у касцюме Чабурашкі сумесна з дзецьмі рабіў шпакоўні.**

*Прыёмная кампанія — 2017*

# МЕДЫЦЫНСКІЯ КАЛЕДЖЫ ПАВЯЛІЧВАЮЦЬ НАБОР

**З сённяшняга дня ў нашай краіне распачынаецца прыёмная кампанія ва ўстановах, якія рыхтуюць спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй.**

Прыём дакументаў ад абітурыентаў, якія паступаюць на бюджэтныя месцы на аснове базавай адукацыі, завяршаецца 3 жніўня, а для абітурыентаў, якія паступаюць пасля заканчэння школы або прафесійна-тэхнічнай навучальнай установы, — 9 жніўня. Пры паступленні на платную форму навучання прыём дакументаў завяршаецца 14 і 16 жніўня адпаведна. Але маладыя людзі, нацэленыя на платнае навучанне, якім трэба здаваць уступныя іспыты па спецыяльнасці, павінны падаць свае дакументы ў тыя ж тэрміны, што і «бюджэтнікі».

Сёлета на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі запланавана прыняць за кошт сродкаў бюджэту на дзённую і завочную формы навучання 24,2 тысячы чалавек. Скарацiць плануецца прыём на эканамічныя спецыяльнасці (на 0,7 працэнта, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту на 3,2 працэнта), а таксама на будаўнічыя (на 7,1 працэнта, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту на 4,6 працэнта). Затое павялічваецца ў параўнанні з папярэднім годам прыём на спецыяльнасці профілю «ахова здароўя» — на 8,7 працэнта (у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту — на 6,4 працэнта).

Набор на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі будзе весціся сёлета па 147 спецыяльнасцях. Свой другі прыём ажыццявіць Мінскі гарадскі педагагічны каледж, які рыхтуе педагагічныя кадры для ўстаноў дашкольнай адукацыі і настаўнікаў пачатковых класаў. Прыём тут праводзіцца на аснове базавай адукацыі па конкурсе пасведчанняў аб заканчэнні дзевяці класаў, а на аснове агульнай сярэдняй адукацыі — толькі на завочную форму навучання (па выніках ЦТ па дзяржаўнай мове і біялогіі).

Між іншым, летась самы высокі конкурс (4,6 чалавека на месца) склаўся ў педкаледжы менавіта на завочную форму навучання сярод ахвотных паступіць на спецыяльнасць «Дашкольная адукацыя» (прахадны бал — 11,31).

Варта нагадаць, што ў сёлетняй прыёмнай кампаніі адбыліся некаторыя змены, якія былі занатаваныя ў новых Правілах прыёму, зацверджаных Указам кіраўніка дзяржавы ў студзені бягучага года. Так, у прыватнасці, для выпускнікоў базавай і сярэдняй школы, якія спыняцца на атрыманні сярэдняй спецыяльнай адукацыі, спрашчаецца некаторыя ўмовы.

Раней у дачыненні да часткі з іх распаўсюджвалася абмежаванне — ім трэба было мець у атэстаце мінімум 4 балы па рускай (беларускай) мове і профільным прадмеце. Цяпер абмежаванне ў дачыненні да рускай (беларускай) мовы знятае, яно засталося толькі па профільным прадмеце. Новаўвядзенне распаўсюджваецца на выпускнікоў 9-х класаў, якія будуць паступаць на спецыяльнасці, дзе конкурс у мінулым годзе склаў тры і больш чалавек на месца, а таксама на адзінаццацікласнікаў, якія не здавалі ЦТ, пры паступленні на спецыяльнасці з конкурсам у 2016 годзе — 1,5 і менш чалавека на месца. Гэта асабліва актуальна для людзей, якія даўно скончылі школу, але хацелі б атрымаць сярэднюю спецыяльную адукацыю.

**Выпускнікоў 11-х класаў могуць залічыць на вакантныя месцы ў групы 2-га курса, набраныя год таму.**

У выпускнікоў сярэдняй школы, якія паступаюць у ССНУ, сёлета была магчымасць здачы трох прадметаў на ЦТ, хоць прыёмнай камісіяй будуць браццa пад увагу ўсё роўна толькі два сертыфікаты. Гэта было зроблена для таго, каб пашырыць магчымасць выбару сярод спецыяльнасцяў.

Нязменнымі таксама змяненні і дапаўненні ў нормы, якія дазваляюць залічваць абітурыентаў без уступных выпрабаванняў, па-за конкурсам, а таксама абітурыентаў, якія маюць перавазжнае права на залічэнне пры роўнай агульнай суме балаў.

Уведзена норма, якая дазваляе грамадзянам нашай краіны, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь не больш як два гады, замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якім прадастаўлены статус бежанца або прытулак у Беларусі, паступаць на ўмовах, прадугледжаных для замежных грамадзян (па выніках субяседавання да 15 кастрычніка).

Новымі правіламі прыёму таксама прадугледжана дадатковая магчымасць для маладых людзей стаць навучэнцамі ССНУ: выпускнікоў 11-х класаў, якія не прайшлі ў бягучым годзе па конкурсе, па іх жаданні могуць залічыць на вакантныя месцы ў групы 2-га курса, набраныя год таму. Але гэта будзе магчымым толькі пры ўмове, калі ў такіх групах ёсць вакантныя месцы.

Залічэнне тых, хто паступае ў ССНУ на бюджэтную форму навучання на аснове базавай адукацыі, адбудзецца не пазней 10 жніўня, а на платную форму — да 16 жніўня. Для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове агульнай сярэдняй адукацыі, прыёмная кампанія завершыцца для «бюджэтнікаў» 14 жніўня і 17 жніўня — для «платнікаў».



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Ведай нашых!*

## МАТЭМАТЫКА З ЗАЛАТЫМ БЛЯСКАМ

**Медаль найвышэйшай пробы заваявалі на IX Міжнародным турніры юных матэматыкаў у Румыніі беларускія школьнікі.**

У адрозненне ад алімпіяд турнір уяўляе сабой камандныя спаборніцтвы навучэнцаў ва ўменні рашаць складаныя даследчыя матэматычныя задачы, правільна і пераканаўча падаваць атрыманыя вынікі і аргументавана адстойваць свой пункт погляду ў дыскусіях.

Турнір складаецца з некалькіх матэматычных баёў, у якіх каманды па чарзе дакладваюць аб сваіх даследаваннях па прапанаваных заданнях, а таксама выступаюць у ролі апанентаў і рэцэнзентаў для іншых удзельнікаў.

Асноўнымі ініцыятарамі і арганізатарамі турніру выступаюць матэматыкі з дзвюх ВНУ: універсітэта Парыж-Сюд (Францыя) і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

За ўсе гады свайго ўдзелу ў Міжнародным турніры юных матэматыкаў беларускія школьнікі заваявалі пяць залатых, тры сярэбраныя і чатыры бронзавыя медалі. Гэта найлепшы вынік сярод усіх краін-удзельніц Міжнародных турніраў юных матэматыкаў.

Вынікам удзелу ў турніры ў 2017 годзе стаў залаты медаль. У рэйтынгу камандаў, якія прынялі ўдзел у турніры, наша дружына заваявала абсалютнае першае месца.

У беларускую каманду-пераможцу ўвайшлі Яўген Забродкі (навучэнец XI класа гімназіі №3 г. Салігорска), Уладзіслаў Зверык (навучэнец IX класа гімназіі №20 г. Мінска), Пётр Ігнаценка (навучэнец X класа Ліцэя БДУ), Васіль Умеранкоў (навучэнец XI класа Ліцэя БДУ), Анатоль Шаціла (навучэнец X класа ліцэя БДУ) і Мікалай Шашко (навучэнец XI класа гімназіі №41 г. Мінска).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*Выпрабавана на сабе*

# Што сказаць, каб атрымаць работу?

## Эксперымент з сумоўямі

**Першае, што трэба зрабіць, каб уладкавацца на працу, — пачаць хадзіць на гутаркі. Гэта самая стрэсавая і складаная частка працэсу. Але ж без яе ніяк. Каб даведацца, пра што зараз пытаюцца падчас такіх гутарак, я прайшла (увага!) 23 сустрэчы ў якасці саіскальніка.**





Размова пойдзе не пра выпадкі, калі абавязкова трэба мець профільную адукацыю (інжынер, урач і г. д.). Вакансіі выбраліся такія, дзе не патрабуецца яе мець: прадавец-кансультант у краме адзення, прадавец у краме будматэрыялаў, адміністратар (офіса, гасцініцы, трэнажорнай залы, салона прыгажосці), менеджар па продажах, кур'ер, дыспетчар, кантралёр-касір, аператар кол-цэнтра і іншыя.

Першае, што робіць любы спецыяліст па рабоце з персаналам — глядзіць ваша рэзюмэ і правярае сацыяльныя сеткі. Таму перад уладкаваннем стварыце прывабнае «партфоліа» і праверце, якая інфармацыя ёсць пра вас у інтэрнэце. У ходзе эксперымента я размясціла ў сеціве шэсць розных варыянтаў рэзюмэ і пачала прэтэндаваць на вакансіі.

Як высветлілася, апынуцца на сустрэчы з работадаўцам — гэта ўжо маленькая перамога. Далёка не кожнае ваша рэагаванне на вакансію атрымае адказ, тым больш, запрашэнне на гутарку. Я адправіла 84 заяўкі розным работадаўцам. Адгукнулася толькі 29 з іх. З 23-ма мы дамовіліся на сустрэчу. 55 кампаній не палічылі патрэбным паведаміць штосьці ў адказ, хоць рэзюмэ ў іх праглядалі.

Далей поспех на 90 працэнтаў залежыць ад вашых паводзін і слоў на самой сустрэчы. Куды б ні ўладкоўваліся, хваляванне аднязначна не дапаможа. Справіцца з ім не так і проста, але можна: падрыхтуйцеся адказваць на мноства пытанняў (лепш нават мець прыблізныя шаблоны адказаў), загадзя прачытайце некалькі артыкулаў пра мову жэстаў, прадумайце, што апранеце, выглядайце ахайна і трымайцеся ўпэўнена.

Наведаўшы 23 гутаркі, я вывела некалькі заканамернасцяў. У пераважнай большасці выпадкаў маім візаві была жанчына ва ўзросце прыкладна ад 30 да 55 гадоў. Калі сустрэча прызначалася на раніцу, яна доўжылася больш часу і слухалі мяне больш уважліва. Дарэчы, усе запрашэнні на работу я атрымала ад тых прадстаўнікоў кампаній, з якімі мы сустракаліся ў першай палове дня.

Пра пытанні, што задаюць саіскальнікам, можна напісаць асобную кнігу. Ёсць сярод іх і самыя распаўсюджаныя. Напрыклад, розныя пытанні пра хобі і тое, чым вы любіце займацца ў вольны час, чым цікавіцеся, што чытаеце. Тут не можа быць правільных ці няправільных адказаў. Усё залежыць ад таго, чаго чакае ад вас работадаўца. Калі вакансія не мае на ўвазе вашага знаходжання на працоўным месцы ў адзіноце, лепшымі адказамі будуць тыя, што звязаны з камандным гульнямі, што паказваюць вашае імкненне знаходзіцца сярод людзей і ўменне ўзаемадзейнічаць з імі.

Часта просяць: «Раскажыце пра сябе». Тут не чапайце тэмы асабістыя (дзе вы нарадзіліся, што любіце есці на сняданак). Раскажыце пра свае дасягненні, моцныя бакі і рысы, якія могуць падысці для працы ў канкрэтным месцы і адпаведнай сферы.

Усе пытанні накшталт «як вы бачыце сябе ў нашай кампаніі праз два гады», «чаму вы хочаце працаваць менавіта тут», «якую заработную плату разлічваеце атрымліваць» таксама разлічаны найперш на тое, каб убачыць, наколькі сур'ёзна вы настроены на гэтую работу, ці маеце амбіцыі і якія. Мне не патэлефанавалі пасля тых сустрэч, дзе я не выказвала нават крыху перабольшанай зацікаўленасці работай у той ці іншай кампаніі.

Яшчэ адзін момант, які часта хвалюе работадаўцу — вопыт. Калі ў вас яго няма, не падманвайце, так і скажыце. Але ў гэтым выпадку пажадана абавязкова «перакрыць» гэты недахоп чымсьці важным. Напрыклад, іншымі сваімі дасягненнямі, якія дапамогуць вам справіцца і з гэтай работай. Калі вопыт ёсць, распішыце яго ва ўсёй красе.

З усёй масы праведзеных сустрэч я атрымала толькі 11 запрашэнняў на працу (гэта з улікам таго, што вакансіі не патрабавалі нейкіх звышспецыфічных навыкаў). Мне здаліся больш-менш цікавымі месцамі з нядрэннымі ўмовамі толькі 7 з гэтых 11.

Таму, калі вы зараз у пошуку работы, будзьце гатовыя да мноства спроб, на некалькі сустрэч за дзень і... пастаяннага чакання адказу. І ўсё ж такі, калі жаданне ўладкавацца сапраўды ёсць, на адной з гутарак вы зразумееце, што нарэшце знайшлі, што хацелі.

**Дар'я АРЭФ'ЕВА.**

# НЕ ЎМЕЕШ ТАНЦАВАЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



**Пад прыцэлам фотакамеры ахвотнікаў есці суп большае.**

Падчас трэцяга этапу кандыдаты ў атрад рыхтуюць творчыя мерапрыемствы. Апошняе выпрабаванне — вызяная вучоба. Моладзь адпраўляецца на тры дні ў дзіцячы лагер, дзе мадэлюецца змена. Так важатыя могуць і з месцам азнаёміцца, і розныя педагагічныя сітуацыі адпрацаваць. Разбіраюць, што рабіць, калі дзіця плача і хоча да мамы, калі хтосьці самавольна выйшаў з атрада, пабіўся ці атрымаў траўму.

— А як дзейнічаць, калі падлетак закахаўся ў важатага? — падкідваем задачку для роздуму.

— У ідэале — адцягнуць увагу, пераключыць яе на нешта іншае. Трэба пагаварыць з падлеткам. У крайнім выпадку — перавесці важатага далей ад гэтага дзіцяці, — адказвае Уладзімір.

**Некаторыя кажуць: ну, усё, гэта змена апошняя. І на наступны год зноў прыязджаюць.**

Каманда атрада цалкам закрывае ўвесь штатны расклад лагера па педагогах. На думку Уладзіміра Самуленкава, гэта ідэальны варыянт. «У моладзі больш энергіі. Калі важаты не можа танцаваць на дыскатэцы, гэта не важаты. Дзеці маладым больш давяраюць.



**Важатая Настасся Шыцік разам з атрадам рэпетуе дэвіз.**

Дый самім аднагодкам камфортней працаваць у такім калектыве».

Галоўнае правіла важатага — асабісты прыклад ва ўсім. Разам з дзецьмі яны ходзяць на прабежку, гуляюць у мяч, ядуць на абед першае, другое і кампот. А як яшчэ прымусіць школьнікаў гэта рабіць?

## ШКІЛЕТ І ФІЯЛЕТАВЫЯ ВАЛАСЫ

Міма па дарожцы праходзіць малеча з музычнымі дыскамі на шыі. Сёння Дзень саўндтрэкаў, тлумачаць нам, таму і дрэс-код такі.

**У тэму**

**Сёлета ў БДПУ імя Максіма Танка створана 27 студэнцкіх педагагічных атрадаў, у якіх працуе 470 чалавек. Пераважна гэта навучэнцы 2—4 курсаў.**

Увогуле, кожная змена ў лагеры тэматычная. Цяперашняя прысвечана кіно. У адпаведнасці з тэматыкай афармлены і атрадныя куткі. Зазіраем да «Піратаў». На ўваходзе — сцяг марскіх разбойнікаў, куфар са скарбам і... шкілет. «Гэта важаты, які тут даўно працуе», — жартуюць усе.

Кіношнай стылістыцы стараюцца адпавядаць і педагогі атрадаў. Адна з дзяўчат спецыяльна пафарбавала валасы ў фіялетавы колер, каб быць у тэме коміксаў.

Надвор'е сёння сонечнае, таму ў карпусах амаль нікога няма. Усе дзеці адпачываюць на вуліцы. Адны рэпетуюць нумары да конкурсу пародый на музыкаў, іншыя гуляюць у футбол. Разам з хлопчыкамі ганяе мяч і **важаты Яфім ЕФІМЕНКА.** У педатрадзе ён працуе першы год.

— Я быў тут адну змену піянерам, і зацягнула, — усміхаецца хлопец.

Навічку даручылі дзяцей 10—11 гадоў. Спраўляецца. «У гэтым узросце ў дзяцей яшчэ не сфарміраваны свой погляд на ўсе пытанні. Таму ім лягчэй паказаць, што правільна, а што не, — лічыць Яфім. — Ёсць, вядома, закрытыя дзеці — вось з імі складана».

З дысцыплінай у атрадзе ў важатага пытанняў не ўзнікае: яго, хлопца, малыя слухаюцца лепш, чым дзяўчат. Але з педагогікай Яфім ніяк не звязаны: ён вучыцца на другім курсе Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў на гукарэжысёра.

## ПРАВІНІЎСЯ — РЫХТУЙ ФЛЭШ-МОБ

Для **Марыі ПЕТРАЖЫЦКАЙ і Настассі ШЫЦІК** гэта змена далёка не першая. Марыя прыязджае на лета ў «Ветразь» шосты год запар, Настасся — чацвёрты. Тут яны педагог-арганізатар і важатая старшага атрада, па-за межамі лагера — другі рэжысёр на кінастудыі і настаўніца малодшых класаў.

Цікавімся ў дзяўчат, з дзецьмі якога ўзросту лягчэй працаваць.

— Мне прасцей са старэйшымі, — адказвае Настасся. — З імі трэба быць сябрам. Але не пераходзіць мяжу. Так, пры дзецях мы, важатыя, заўсёды называем адзін аднаго па імені і імені па бацьку.

— Важна старацца быць справядлівымі ў адносінах да іх. Тады дзецям будзе сорамна вас не слухацца і рабіць нешта дрэннае, — дадае Марыя. — А з маленькімі трэба быць яшчэ і крыху клоўнам. Падмяняць маму, бо не ўсе ўмеюць завязваць сабе шнуркі і заплятаць коскі.

— А калі дзеці не слухаюцца? Караеце?

— Даём тым, хто правініўся, заданне — зрабіць нешта крэатыўнае, напрыклад, падрыхтаваць да дыскатэкі флэш-моб.

У падлеткаў у лагеры, дарэчы, ёсць выдатная матывацыя добра сябе паводзіць. Найлепшы атрад па выніках змены атрымлівае сцяг «Ветразя», а старэйшыя дзеці запрашаюцца на наступны год у важатыя.

Цяперашнія школьнікі, па назіраннях дзяўчат, вельмі адрозніваюцца ад іх пакалення. Дзеці не ведаюць многія, здавалася б, папулярныя фільмы — яны глядзяць ютубераў, а не кіно.

**Лічба**

**За змену важатыя педатрада «Ветразь» атрымліваюць ад 350 да 410 рублёў.**

Самае складанае ў рабоце педатрада — адразу ўвайсці ў тэмп. Тут не бывае, што важаты сядзіць на лаўцы, а дзеці недзе гуляюць.

— А які любімы момант за ўсю змену?

— Апошні важацкі канцэрт, — у адзін голас адказваюць Марыя і Настасся. — Кожны раз стараемся не рабіць сумных нумароў, але ўсё роўна плачам.

## ПРАМЯНЯЦЬ ПАРЫЖ НА «ВЕТРАЗЬ»

— Рыцары, хэй! Рыцары, хэй! — дружна рушыць адзін з малодшых атрадаў у напрамку сталовай. Літару «р» вымаўляюць не ўсе, але гэта не перашкаджае скандзіраваць крычалку.

На першае — фасолевы суп. Супы дзятва не вельмі любіць, але, заўважыўшы, што іх здымае наш фатограф, наперабой пачынаюць падсоўваць талеркі для дабаўкі.

— Максім Ігаравіч, мы раскусілі яго: ён не веган, а націк! — са смехам заяўляе хтосьці з хлопчыкаў.

Пасля абеду — ціхая гадзіна. Але важатым няма калі адпачываць. Хтосьці дзяжурыць на калідоры, хтосьці рыхтуе рэквізіт для мерапрыемстваў. Стараюцца, бо на коне — імянная майка (яе атрымліваюць найлепшыя важатыя). Жарт, вядома. Не, прыз у выглядзе імяннной майкі сапраўды ёсць, але ў педатрад ідуць не па яго.

— Я прыязджаю па эмоцыі, — прызнаецца Настасся Шыцік. — У нас ёсць такая гульня — «свечка». У канцы дня мы з дзецьмі садзімся ў кола і дзелімся, што нам за сёння спадабалася ці не. І калі чуеш словы падзякі ў свой адрас — гэта найлепшая ўзнагарода.



**«Ляцеў лебедзь, зламаў крыло»...**

— Мы тут усе крыху апантаныя, — усміхаецца Марыя Петражыцкая. — Памятаю, з намі працаваў хлопчык-мадэль, яму кантракт на два гады ў Парыжы прапаноўвалі. А ён адмовіўся, каб у лагер паехаць. Некаторыя кажуць: ну, усё, гэта змена апошняя. І на наступны год зноў прыязджаюць.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
**Фота Надзеі БУЖАН.**
*Мінск — Мінскі раён — Мінск.*

# КАЛІ ЖАЛЕЗА СКАРАЕЦЦА ДУХУ

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

***— Дзіцячая траўма моцна паўплывала на жыццё?***

— Яшчэ да яе я ведаў, што збіраюся прысвяціць сваю будучыню спорту. Таму гэтае здарэнне не адыграла вырашальнай ролі ў маім лёсе. Хіба што толькі ў падлеткавым узросце мне вельмі не хацелася, каб навакольныя ў першую чаргу бачылі ўва мне інваліда. Неўсвядомлена стараўся адцягнуць увагу іншых ад сваёй праблем са зрокам.

***— Ты нарадзіўся і вырас у вёсцы, але даўно жывеш у Гродне. Лічыш сябе гараджанінам?***

— Не зусім. Ганаруся тым, што «выйшаў з вёскі» і ніколі не забываю дарогу дадому. Выдатна знаёмы з усімі бакамі нялёгкага сельскага жыцця. Яно шмат у чым загартавала мой характар, навучыла абыходзіцца малым і цаніць тое, што маеш.

Першыя крокі ў спорце я зрабіў у роднай вёсцы. Мы жылі даволі сціпла, лішніх грошай ніколі не было. Але мелася такое моцнае жаданне займацца спортам, што я сам майстраваў турнікі, брусы, просценькія трэнажоры. У школьную спортзалу бег хутчэй за ўсіх і выходзіў з яе апошні.

***— Каб дамагчыся сур'ёзных вынікаў, несумненна, патрэбная жалезная сіла волі. А што яшчэ трэба для перамогі?***

— Усведамленне таго, што калі не даб'ешся мэты, потым усё жыццё будзеш дакараць сябе за гэта. Лічу, калі ёсць магчымасць чымсьці займацца, значыць трэба выкарыстоўваць яе на сто працэнтаў. І ніякіх адгаворак быць не можа. Я многім ахвяраваў дзеля спорту. Укладваў у трэніроўкі ўсе грошы, якія зарабляў. Кожную вольную хвіліну сем дзён на тыдзень праводзіў у зале замест таго, каб адпачываць разам з сябрамі і блізкімі. Вядома, вялікі спорт здароўя не дадае, але для мяне дарогі назад няма.

***— На п'едэстале ты чэмпіён. А ці даводзілася прымяняць сілу ў звычайным жыцці?***

